Парламенцкі дзённік

# ФІНАЛЬНАЯ НОТА — ЭКАНАМІЧНАЯ

**На заключным пасяджэнні ў верхняй палаце парламента разгледзелі салідны блок дакументаў фінансавага характару.**

У прыватнасці, на суд сенатараў былі прадстаўленыя бюджэт краіны на наступны год, змяненні ў падатковым заканадаўстве, а таксама праект закона аб крэдытных гісторыях, папраўкі ў закон аб свабодных эканамічных зонах, праект закона аб ратыфікацыі пагаднення з Расіяй аб рэгуляванні пытанняў уласнасці Саюзнай дзяржавы і шэраг іншых. Іх пракаментаваў журналістам Сцяпан Пісарэвіч, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Гэта вельмі важныя законапраекты, у першую чаргу — падатковае заканадаўства. Мы на працягу ўсяго склікання праводзілі вялікую работу па яго ўдасканаленні. Была створана спецыяльная рабочая група пры Урадзе. Мэта была адна — зрабіць падатковую сістэму прасцейшай, зменшыць колькасць падаткаў. Нормы падатковага заканадаўства павінны мець характар прамога дзеяння. У гэтым рэчышчы ўносяцца змены і сёлета.

Пра меры, зафіксаваныя ў законапраекце, мы падрабязна пісалі раней, калі ён разглядаўся ніжняй палатай. Тым не менш, нагадаем некаторыя з іх. Будзе зніжана стаўка збору для сельгасвытворцаў з двух працэнтаў да аднаго. Зменшыцца плата за рэгістрацыю транспартных сродкаў, будзе ўстаноўлена стаўка падаходнага падатку ў памеры 12 працэнтаў. Усе прадугледжаныя змяненні дазволяць знізіць падатковую нагрузку на 1,3 працэнтнага пункта да ВУП і пакінуць у распараджэнні суб'ектаў гаспадарання больш як два трыльёны рублёў.

Бюджэт дзяржавы на 2009 год захавае сацыяльную накіраванасць. «Павышэнне рэальных даходаў насельніцтва — галоўная задача нашай краіны, як і павышэнне дабрабыту людзей, якасці іх жыцця», — адзначыў сенатар. Закладзены ў бюджэце рост заробкаў, найперш у бюджэтнай сферы, арыентаваны на суму ў 550 долараў (у эквіваленце) да канца наступнага года. Больш высокімі тэмпамі будуць фінансавацца выдаткі на такія сацыяльна значныя сферы, як ахова здароўя, адукацыя, спорт і іншае.

— Налета неабходна ўвесці ў эксплуатацыю шэсць мільёнаў квадратных метраў жылля, — дадаў сенатар. — У гэтай сувязі закладзеныя пэўныя сродкі ў выглядзе льготных крэдытаў для насельніцтва.

Паразважаў Сцяпан Пісарэвіч і наконт уплыву фінансавага крызісу на выкананне ўхваленага парламентам бюджэту-2009:

— Вядома ж, крызіс, калі, скажам, і не напрамую, а праз нейкі фондавы рынак, іншыя механізмы, можа нас крануць. І перш за ўсё гэта зніжэнне попыту на нашу прадукцыю. У бюджэце закладзены даволі салідныя механізмы, якія дазволяць кампенсаваць любыя змяненні як на знешніх рынках, так і на ўнутраным. У нас ёсць гарантыі ў бюджэце па росце заробку, забеспячэнні харчовай бяспекі нашай краіны і па забеспячэнні жыллём. Вось гэтыя прыярытэты, якія закладзены ў бюджэце, яны непарушныя, і я думаю, што мы тут зможам справіцца. Вядома ж, самае галоўнае сёння — павышаць унутраны попыт. Нават калі нейкія знешнія фактары будуць уплываць на нашу прадукцыю, каб мы маглі за кошт унутраных крыніц павышаць сваю канкурэнтаздольнасць.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# «Да 2015 года беларуская армія будзе поўнасцю перааснашчана і прыведзена ў адпаведнасць самым высокім сусветным стандартам»

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні беларускіх і замежных журналістаў па завяршэнні аператыўнага комплекснага вучэння «Восень-2008».**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, перыяд спаду для Узброеных Сілаў Беларусі, таксама як і іх станаўлення і асноўнага пераасншчэння, завяршыўся. Яшчэ ў сярэдзіне 90-х Беларусь сур'ёзна занялася выпрацоўкай канцэпцыі, планаў абароны дзяржавы і мадэрнізацыі Узброеных Сілаў. У выніку Беларусь поўнасцю аднавіла сваю абараназдольнасць.

«Некалі армія знаходзілася ў сумным стане, людзі саромеліся насіць пагоны. Таму я надзеў ваенную форму, каб прадэманстраваць, што армія цяпер у пашане ў нашым грамадстве і выйшла на ўзровень практычна 100-працэнтнай баявой гатоўнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

За апошні час ваенна-палітычная абстаноўка ў свеце значна змянілася.

«Мы сёння дакладна ведаем, што такое сучасная вайна, вывучылі вопыт вядзення ваенных дзеянняў у канфліктных сітуацыях на прыкладзе іншых дзяржаў», — адзначыў Прэзідэнт.

Калі падчас вучэнняў дзесяцігадовай даўнасці беларуская армія «ваявала» фронт на фронт, то цяпер гэта поўны анахранізм. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ніхто такімі франтамі, як гэта было ў мінулым стагоддзі, супраць нас ваяваць не будзе. Калі нават яна была б на тэрыторыі нашай краіны, то гэта была б для нашага праціўніка самая нявыгадная вайна — сам прыродны ландшафт вызначае гэты факт. Таму і рыхтавацца трэба да іншага: цяпер войны вядуцца з выкарыстаннем высокадакладных узбраенняў і высокадакладных спосабаў прымянення гэтых узбраенняў. «Улічваючы гэтыя фактары, вучэнне, якое завяршылася, выгадна адрознівалася ад папярэдніх», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы ідзём за часам, бачым, якія цяпер войны, — адзначыў Прэзідэнт. — Больш за тое, мы прагназуем, што будзе надалей».

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што вучэнні праводзяцца не толькі для трэніроўкі, але і для таго, каб паказаць, што з Беларуссю мецы справу шляхам высвятлення адносінаў праз прыцэл зброі «смяротна небяспечна». Паводле вызначэння беларускага лідара, «вучэнні — гэта фактар вялікага стрымлівання».

Галоўнакамандуючы — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ва Узброеных Сілах дастаткова кадраў, створаны падраздзяленні тэрытарыяльнай абароны, перабудавана армія, зроблена ўсё неабходнае, каб кіраваць дзяржавай у крызісныя моманты. Так, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, сёння пры неабходнасці Беларусь можа адмабілізаваць да 500 тысяч чалавек.

Звяртаючыся да пытання кантрактнай службы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, напрыклад, у спецпадраздзяленнях павінны служыць падрыхтаваныя шматвопытныя афіцэры. Аднак ваенным вадзіцелем ці нават мотастралком можа служыць амаль кожны беларускі юнак. Таму тэрміновая служба, дзе гэта магчыма, будзе выкарыстоўвацца і надалей.

Аляксандр Лукашэнка даў пазітыўную ацэнку ўзаемадзеянню беларускіх і расійскіх ваенных падчас праведзеных вучэнняў.

«Я вельмі ўдзячны расіянам, якія прыбылі ў Беларусь для ўдзелу ў гэтым вучэнні. Але шчыра скажу: хацелася б большай прысутнасці нашых братоў-расіян у такіх вучэннях», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Вядома ж, гэта не танная справа, але выдаткі таго каштуюць.

Закранаючы ўзаемадзеянне з партнёрамі ў рамках Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць у тым, што ў АДКБ ёсць вельмі вялікія перспектывы.

«У АДКБ зроблена нямала, але трэба яшчэ вельмі многа працаваць, каб стаць у бліжэйшы час патэнцыяльна надзейнай апорай гэтага рэгіёна планеты, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — У гэтай арганізацыі ёсць вельмі вялікая перспектыва. Прынамсі, беларусы будуць рабіць усё, каб АДКБ стала і добрым, надзейным партнёрам для тых, хто хоча з намі супрацоўнічаць, і добрым стрымальным фактарам для тых, хто спрабуе бразгаць зброяй».

**Сяргей ПРОТАС.**

## Абзац

■ Нацыянальная кампанія «Белавія» аб'явіла аб зніжэнні кошту авіябілетаў на рэйсы з Мінска ў Рым і Мілан. Кошт білетаў у абодва бакі складзе 199 еўра (без аэрапортавых збораў і таксаў). На білеты для дзяцей да 2-х гадоў прапануецца скідка ў памеры 90 працэнтаў, для дзяцей ад 2 да 12 гадоў яна складае 25 працэнтаў. Продаж білетаў па спецыяльных тарыфах будзе ажыццяўляцца да 30 лістапада г.г., а падарожнічаць можна па такіх білетах да 31 сакавіка 2009 года (за выключэннем перыяду з 15 снежня 2008 года па 15 студзеня 2009 года).

**■ У Клімавічах дзесяцікласнік у чатыры гадзіны раніцы ўзламаў дзверы раённай арганізацыі Чырвонага Крыжа і скраў мікрахвалевую печ. Затым падпаліў офіс, каб схаваць сляды крадзяжу. Агонь быў патушаны супрацоўнікамі раённага падраздзялення МНС. Узбуджана крымінальная справа.**

■ Іспанская паліцыя затрымала 27 чалавек за продаж і выкарыстанне падробленых дыпломаў аб вышэйшай адукацыі. Большасць дакументаў прададзеныя па такіх спецыяльнасцях, як урач і юрыст. Іх кошт — каля $24 тыс. Сярод арыштаваных — два навуковыя супрацоўнікі, што распаўсюджвалі падробленыя дыпломы ўніверсітэта Перу. Астатнія былі пакупнікамі і паспелі пакарыстацца фальшывымі дакументамі. Большасць з іх працавала ў прыватных клініках, дамах састарэлых і ў салонах прыгажосці. Падазроных затрымалі ў 17 гарадах Іспаніі, у т.л. у Мадрыдзе і Барселоне.

**■ Скрыпка Антоніа Страдывары коштам 3 млн еўра скрадзеная з памесця пад Гановерам. Яна захоўвалася ў радавым палацы нямецкага скрыпача і дырыжора Радэрыка фон Бенігсена. Інструмент быў скрадзены яшчэ ў пятніцу, 17 кастрычніка, аднак вядома аб гэтым стала толькі праз некалькі дзён. Па словах прадстаўніка нямецкай паліцыі, зладзеі вынеслі таксама яшчэ адну скрыпку, фамільныя ордэны, карціну і срэбныя падсвечнікі.**

## Поўны абзац



■ Ізраільскі салон прыгажосці прапануе ўнікальную паслугу — змяіны масаж. Як запэўніваюць спецыялісты, экзатычная працэдура дапамагае зняць боль і напружанне ў мышцах і суставах. У салоне выкарыстоўваюць неядавітых каралеўскіх змей з Каліфорніі і Флорыды, а таксама плямістых і малочных гадаў, кантакт з якімі дастаўляе кліентам нязведаныя раней адчуванні. Кошт паслугі — 70 долараў. Даўжыня змей пры гэтым залежыць ад тыпу масажу: больш буйныя здымаюць боль у мышцах спіны, а больш дробныя выклікаюць эфект агульнага расслаблення. Многія гавораць, што нават проста патрымаўшы ў руках змяю, пачынаюць адчуваць сябе лепш. Як адзначаюць наведвальнікі, плаўныя рухі гадаў па спіне нагадваюць халодны кампрэс.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# Па эканамічных злачынствах складана кампенсаваць страты

**Аналіз барацьбы з эканамічнымі злачынствамі ў перыяд з 2004 года па сёння паказаў, што па частаце здзяйснення ў тройку «лідараў» карупцыйных злачынстваў уваходзяць хабарніцтва, службовы падлог і раскраданні шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі.**

Паводле слоў **старшага пракурора аддзела Генеральнай пракуратуры Валерыя КОРАНЕВА,** за чатыры гады маёмасныя страты склалі звыш 53 мільярдаў рублёў. Сёлета — звыш 32 мільярдаў. Характэрна, што доля кампенсацыі страт па такіх злачынствах невялікая — не больш за 15 працэнтаў. Тлумачыцца гэта тым, што злачынствы падобнага кшталту здзяйсняюць, як правіла, асобы з вышэйшай адукацыяй, якія ўмеюць дасканала распрацаваць канспіратыўны план рэалізацыі злачынных намераў. На момант жа выяўлення гэтых намераў скрадзенае звычайна аказваецца пераведзеным на сваякоў ці знаёмых. Так што падчас расследавання на канкрэтную асобу, як правіла, не зарэгістравана ніякай маёмасці, нерухомасці, аўтамабіляў, банкаўскіх актываў і г.д.

— Усімі праваахоўнымі органамі была праведзена вялікая работа, скіраваная на барацьбу з пералічанымі відамі злачынстваў, што дазволіла знізіць колькасць такіх злачынстваў летась на 23 працэнты ў параўнанні з 2004-м, — адзначыў Валерый Коранеў. — На жаль, выяўляюцца і недахопы пры расследаванні крымінальных спраў. На гэта вострa рэагуе і Генеральная пракуратура, і пракуроры на месцах. Толькі ў 2007 годзе за розныя ўпушчэнні і недахопы пры расследаванні крымінальных спраў працэсуальнага і крымінальнага заканадаўства пракурорамі было ўнесена звыш 30 прадстаўленняў, узбуджана звыш 20 дысцыплінарных спраў. Да рознай ступені адказнасці прыцягнуты больш за сотню супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якімі расследуецца львіная доля вышэйпамянёных злачынстваў...

Як паведаміла **старшы следчы па асабліва важных справах Генеральнай пракуратуры Святлана БАЙКОВА,** у 2004 годзе супрацоўнікамі КДБ па Магілёўскай вобласці была спынена дзейнасць асобаў, якія займаліся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю, звязанай з рэалізацыяй нехарчовай спіртавой вадкасці. Падчас расследавання было ўстаноўлена, што на пачатку 2000 года жыхары Мінска і Магілёва стварылі на тэрыторыі краіны злачынную групу для незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці па вытворчасці і рэалізацыі спіртавых вадкасцяў па падробленых дакументах. «Вадкасць» рэалізоўвалася як на тэрыторыі нашай краіны, так і за яе межамі.

Кіраўнікі злачыннай групоўкі арганізавалі з 2000 па 2003 год тры прыватныя прадпрыемствы, атрымалі адпаведныя ліцэнзіі ў канцэрне «Белбіяфарм» і Міністэрстве аховы здароўя на вытворчасць фармацэўтычных і нехарчовых вадкасцяў, такіх, як антысептык для апрацоўкі драўніны. Распрацавалі схему атрымання нарадаў і адпаведна буйных партый спірту ў канцэрнах «Белбіяфарм» і «Белдзяржхарчпрам» па гэтых нарадах. Былі арганізаваны і вытворчыя цэхі ў Магілёве і Мінскай вобласці. Вытворчасць заключалася ў разбаўленні хімічнымі дабаўкамі тэхнічнага спірту, атрыманага на прадпрыемствах краіны, пасля чаго сумесь рэалізоўвалася як пітны спірт. Асобная група суправаджала грузавыя аўтамабілі, на якіх вадкасці дастаўляліся «заказчыкам».

Злачынная групоўка рэалізавала за чатыры гады звыш 6 мільёнаў літраў і атрымала даход у памеры 15 мільярдаў рублёў. Дзейнасць згаданых прадпрыемстваў не аднойчы правяралася, але фіктыўнасць накладных і іншых дакументаў удалося выявіць толькі падчас аператыўных мерапрыемстваў. Адладжаны працэс спыніла затрыманне ў момант перагрузкі вадкасці прыватным асобам. Далей былі ўстаноўлены 50 асобаў, якія бралі ўдзел ва ўсёй дзейнасці. Асуджаны 44 чалавекі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## У СВЕЦЕ ЎСЁ МЕНШ ПАВАЖАЮЦЬ СВАБОДУ СЛОВА

**Паводле апублікаванага ў Парыжы даклада міжнароднай праваабарончай арганізацыі «Рэпарцёры без межаў», сітуацыя са свабодай прэсы ў вядучых краінах свету ў параўнанні з мінулым годам пагоршылася.**

Расія палепшыла свой рэйтынг і заняла 141-е месца (летась было 144-е). Грузія перамясцілася на 120-е месца ў параўнанні з 66-м, на якім яна знаходзілася летась. Падзенне адбылося, як адзначаюць абаронцы правоў журналістаў, з-за канфлікту з Расіяй. Тым часам ЗША апусціліся са 111-га месца на 119-е. Ізраіль у тым жа рэйтынгу апусціўся са 103-га месца на 149-е.

## ІНДЫЯ ШУКАЕ НА МЕСЯЦЫ СУПЕРПАЛІВА

**Індыя запусціла свой першы месяцовы навукова-даследчы касмічны апарат — спадарожнік «Чандраян-1».**

Акрамя іншага, адной з мэтаў месяцовай экспедыцыі будзе пошук радовішча гелія-3 — ізатопу, які дазволіць атрымаць наймагутнейшае паліва, што прывядзе да перавароту ў сусветнай энергетыцы. З геліем-3 сучасная навука звязвае вельмі вялікія надзеі. Справа ў тым, што ў выніку тэрмаядзернай рэакцыі адной тоны гелію-3 з 0,67 тоны дэйтэрыю вызваляецца энергія, эквівалентная згаранню 15 мільёнаў тон нафты. Такім чынам, прадукты распаду 10 тон гэтых рэчываў змаглі б забяспечваць электраэнергіяй усё насельніцтва ЗША на працягу цэлага года. Акрамя таго, рэакцыя гелію-3 з дэйтэрыем не валодае радыеактыўнасцю, гэта значыць абсалютна бяспечная для чалавека.

Аб магчымасці паспяховага вырашэння навуковай праблемы здабычы і транспарціроўкі гелію-3 на Зямлю неаднаразова заяўляў былы прэзідэнт Ракетна-касмічнай карпарацыі РФ «Энергія» Мікалай Севасцьянаў. Аднак шматлікія даследчыкі лічаць гэтую ідэю авантурай.

## ПАДУШКА БЯСПЕКІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**Як стала вядома газеце, Нацыянальны банк Беларусі і Ўрад звярнуліся ў Міжнародны валютны фонд з просьбай аб прадастаўленні рэзервовага крэдыту ў памеры ад 2 мільярдаў долараў ЗША.**

— Мы маем права на такую просьбу, — пацвердзіў карэспандэнту «Звязды» гэтую інфармацыю **начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанка Анатоль ДРАЗДОЎ.** Каментуючы апошні крок, Анатоль Драздоў заўважыў, што нічога звышнатуральнага ў гэтым выпадку не адбылося.

— У сувязі з крызіснымі з'явамі, якія назіраюцца ў суседніх краінах, у нашых гандлёвых партнёраў, могуць узнікнуць праблемы і ў нашай рэспубліцы. У прыватнасці, заўважана, што пакупнікі беларускіх тавараў адчуваюць цяжкасці ў своечасовых разліках за іх. І для таго каб папярэдзіць негатыўныя з'явы ў нашай эканоміцы, забяспечыць яе бесперабойную працу і зададзеныя тэмпы росту, мы вырашылі сфарміраваць падушку бяспекі. Таму і звярнуліся да такога рэсурсу, як знешнія запазычанні. Акрамя таго, мы вывучаем магчымасць атрымання крэдытаў з іншых крыніц: у свеце хапае краін, з якімі ў нас склаліся добрыя ўзаемаадносіны і якія маюць грошы.

Між іншым, паводле звестак інфармагенцтваў, міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын паведаміў аб прынцыповым рашэнні выдзеліць Беларусі стабілізацыйны крэдыт Ураду РФ на 2 мільярды долараў ЗША — па адным мільярдзе долараў у 2008 і 2009 гадах.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# Дзень БАТЭ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Сёння мае футбалісты прымусілі «Зеніт» уключыць максімальныя абароты. Так, ім было няпроста, улічваючы, што гэта 4-я гульня за 11 дзён. Але гэта не змяншае вартасцяў нашай каманды, якая паламу, агрэсіўна і ў цэлым граматна згуляла, не дала разгарнуцца Аршавіну і Дані. На мой погляд, нягледзячы на тое, што каля нашых варотаў было шмат вострых момантаў, вынік адпавядае гульні. Чакаў, што «Зеніт» будзе больш востра гуляць у атацы. Лік заўсёды на табло — а колькі нам білі ў вароты, вышэй за вароты — гэта не важна».

«Хлопцы панурыя сядзяць у распранальні, ёсць невялікае расчараванне», — заявіў Віктар Ганчарэнка. «Мы неаднаразова ў гэтым сезоне, павёўшы ў ліку, утрымлівалі перавагу. Але ў «Зеніта» добрыя нападаючыя, якія могуць і ствараць моманты, і рэалізоўваць», — пахваліў саперніка Віктар Ганчарэнка, А Дзік Адваакат з ім не пагадзіўся: «Каэфіцыент карыснага дзеяння ў атацы быў не такі высокі, як хацелася б. Я ж сам не магу забіваць галы. Калі я быў малады, так, забіваў, а цяпер жа не магу. БАТЭ вельмі добрая, хуткая каманда, якая дзейнічае агрэсіўна і шчыльна і любіць гуляць на контратаках».

Паўабаронца БАТЭ і аўтар гола ў вароты «Зеніта» Павел Няхайчык падзяліўся ўражаннямі пасля гульні: «Цяпер мы глядзім на Лігу чэмпіёнаў іншымі вачыма. Мы ідзём крок за крокам, глядзім, як развіваецца сітуацыя ў нашай групе і карэктуем свае задачы. Хацелася б верыць у тое, што гол, забіты ў Лізе чэмпіёнаў «Зеніту», падняў маю вагу на трансферным рынку і наблізіў пераход у больш сур'ёзны клуб. Хоць БАТЭ выдатны клуб. Проста хацелася б выступаць на больш высокім узроўні, чым чэмпіянат Беларусі. У Расіі? Чаму б і не?»

У той жа час паўабаронца БАТЭ **Ігар Стасевіч** аказаўся ў цэнтры ўвагі селекцыянераў піцерскага «Зеніта». «Гульня беларускага клуба ўжо зрабіла ўражанне ў Еўропе, і паглядзець на гульцоў гэтага клуба ў Санкт-Пецярбург прыедзе не адзін скаўт», — спасылаецца на інфармаваную крыніцу Live.ru. Пасля матча футбаліст заявіў: «Калі шчыра, у многіх нашых хлопцаў засталіся непрыемныя адчуванні. Зенітаўцы вельмі часта гулялі брудна, груба, білі спадцішка. Таму з матывацыяй у Мінску ў нас праблем не будзе, і гульцоў «Зеніта», абяцаю, чакае сур'ёзны бой».

**Андрэй Аршавін** з характэрнай для расійскага футбола праматой і адпаведнай лексікай адгукнуўся аб выніках матча. Моўныя вынаходствы пакінем за кадрам, вось яго ўражанні ад матча: «Мяркую, ні ў кога не выклікала сумненняў, што клас нашай каманды вышэйшы, чым у БАТЭ. Але клас на вынік гульні не ўплывае. Уплывае тое, як людзі ўмеюць канцэнтравацца, а таксама выкарыстоўваць свае моманты. Добра, што Фаціху ўдалося забіць, гэта лепш, чым прайграць з лікам 0:1. У Мінску будзе зусім іншы матч. Пакуль не ведаю, добры ці дрэнны. Упэўнены толькі ў адным — ён будзе іншым. І трэба да яго падрыхтавацца, разабраць памылкі, каб у сустрэчы ў адказ не схібіць, як сёння мы гэта зрабілі перад нашымі балельшчыкамі».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**(Працяг тэмы на 4-й стар.)**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Котяги, Михановичского с/с, площадью 0,2477 га, кадастровый номер 623684203601000184. Начальная цена 33 198 640 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.08.2008 г. Аукцион состоится **11.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства**

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | **Право заключения договора аренды земельного участка под строительство объекта придорожного сервиса (пункт быстрого питания с автостоянкой)** |
| **Арендодатель земельного участка** | Кобринский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Кобрин, пл. Ленина, д. 3. Тел. 8(01642) 2 32 82 |
| **Адрес земельных участков/ Кадастровый номер земельного участка** | Брестская область, Кобринский район, автодорога М1/Е30 Брест (Козловичи)—Минск—граница Российской Федерации (Редьки), 51 км (лево)/ № 124300000001000730 |
| **Размер (площадь) земельных участков, га** | 0,8908 |
| **Срок аренды земельных участков, лет** | 50 |
| **Целевое назначение земельного участка** | для строительства объекта придорожного сервиса (пункт быстрого питания с автостоянкой) |
| **Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений** | 0,4122 га расположено под древесно-кустарниковой растительностью, 0,0800 га прочие неиспользуемые. Подъезд к участку будет осуществляться по автодороге Брест—Минск—граница РФ.<br>Установлены ограничения в использовании земельного участка на площади 0,1100 га в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи и радиофикации, и на площади 0,8909 га в водоохраной зоне реки Мухавец. |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 1 104 770 |
| **Размер задатка, руб.** | 110 470 |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Земельный участок предоставляется победителю аукциона с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализацией в установленном порядке древесины.<br>Земельный участок изымается для проведения аукциона на право заключения договора аренды с условиями:<br>внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в т.ч. с гос. регистрацией в отношении создания земельного участка, а также убытков и упущенной выгоды в сумме 249,07 тыс. рублей, причиненных СПК «Вербное» изъятием земельного участка и потерь сельскохозяйственного производства в сумме 31522,4 тыс. рублей, вызванных изъятием сельскохозяйственных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хоз-ва;<br>заключения победителем аукциона с Кобринским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта;<br>осуществления строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;<br>снятия плодородного слоя почвы и использования его для благоустройства территории объекта. |
| **Организатор аукциона** | ***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11. Тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85. www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by*** |

Аукцион состоится **28 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельных участков на местности осуществляет арендодатель.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

**Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:** подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

***Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 23 октября 2008 г. по 24 ноября 2008 года включительно.***

Артэрыі эканомікі

# СЁЛЕТА ДАРОЖНІКІ ВЫКАНАЮЦЬ НАМЕЧАНЫ ПЛАН

## Налета дарожная служба Беларусі будзе адзначаць 200-годдзе

**Аўтадарогі з цвёрдым пакрыццём забяспечваюць транспартныя сувязі ўсіх гарадоў, гарадскіх пасёлкаў, райцэнтраў, цэнтральных сядзібаў сельскагаспадарчых арганізацый і часткі іншых сельскіх населеных пунктаў. Дарожная сетка ўжо не патрабуе будаўніцтва дарог па новых накірунках, акрамя абходаў гарадоў. Такім чынам, цяпер працягласць сеткі аўтадарог агульна карыстання складае больш за 85 тысяч кіламетраў, з якіх 15,4 тысячы — рэспубліканскія і крыху больш за 70 тысяч — мясцовыя. Пры гэтым асноўную ролю адыгрываюць, безумоўна, рэспубліканскія, па якіх перавозіцца звыш 70 працэнтаў усіх пасажыраў і грузаў.**

Паводле слоў намесніка міністра транспарту і камунікацый — дырэктара Дэпартамента «Белаўтадар» Анатоля ЛЫЦІНА, сёння нямала робіцца дзеля падтрымкі сеткі аўтадарог у бесперабойным, адносна бяспечным стане. На шэрагу ўчасткаў укараняюцца новыя тэхналогіі самага шырокага спектра, абнаўляецца дарожная тэхніка. Аднак транспартна-эксплуатацыйны стан дарожнай сеткі яшчэ не ў поўнай меры задавальняе патрэбы народнай гаспадаркі ў аўтамабільных перавозках.

— Асаблівую занепакоенасць па-ранейшаму выклікае штогадовае павелічэнне недарамонтаў аўтадарог агульнага карыстання, — кажа Анатоль Лыцін. — Большасць рэспубліканскіх і мясцовых аўтадарог, у тым ліку каля 11 тысяч кіламетраў грунтовых, эксплуатуюцца з пратэрмінаванымі міжрамонтнымі тэрмінамі. Не менш складаная праблема — транспартна-эксплуатацыйны стан аўтадарожных мастоў і пуцеправодаў, каля 40 працэнтаў якіх не адказваюць нарматыўным патрабаванням...

Ускладняе сітуацыю і пастаянны рост нагрузкі на дарожныя пакрыцці, хуткі рост транспартных сродкаў, колькасць якіх на сёння набліжаецца да 3 мільёнаў. Паводле прагнозаў, у бліжэйшыя пяцьшэсць гадоў колькасць аўтасродкаў вырасце да 4 мільёнаў. Істотна павялічылася за апошнія шэсць гадоў і колькасць цяжкіх і буйнагабарытных транспартных сродкаў — з 44 да 80 тысяч.

Да 2015 года, згодна з галіновай праграмай «Дарогі Беларусі», будзе ажыццяўляцца мадэрнізацыя дарог на ўсіх накірунках міжнародных транспартных калідораў. Будзе паляпшацца эксплуатацыйны стан важнейшых рэспубліканскіх дарог. Намечана рэканструкцыя 314 км дарог паводле нарматываў 1-й катэгорыі з пашырэннем праезнай часткі да чатырох палос руху. У тым ліку на працягу дарогі М-4 Мінск — Магілёў, М-5/Е271 Мінск — Гомель на ўчастку Пухавічы — Бабруйск, М-6 Мінск — Гродна на ўчастку Шчучын — Гродна, Р-28 Мінск — Маладзечна — Нарач на ўчастку Ратамка — Заслаўе. Вызначаны аб'ёмы работ па будаўніцтве абыходаў гарадоў Баранавічы, Віцебск, Гродна, Слонім, Маладзечна і іншых. Да 2011 года запланавана будаўніцтва звыш 600 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу. У цэлым выкананне праграмы дазволіць забяспечыць штогадовы прырост ВУП у памеры 2,1 працэнта.

Фінансаванне праграмы «Дарогі Беларусі» забяспечваецца, праўда, толькі на 60-70 працэнтаў ад патрэбы. Таму Дэпартамент «Белаўтадар» вымушаны браць крэдыт, дзякуючы якому, як мяркуецца, удасца выканаць сёлетнія паказчыкі ў поўным аб'ёме.

Сёлета на дарогах агульнага карыстання плануецца рэканструяваць або ўвесці новых звыш 180 км аўтадарог і 1150 пагонных метраў новых мастоў на дарогах агульнага карыстання.

Па бягучым рамонце на рэспубліканскіх дарогах праграма дарожных работ выканана на 102,5 працэнта, па рэканструкцыі і будаўніцтве — на 100,1. На мясцовых дарогах праграма выканана на 101,7 працэнта, па рэканструкцыі і будаўніцтве аб'ектаў — на 103,2, па бягучым рамонце — на 102,3.

Завершана будаўніцтва паўночнага аўтадарожнага абыходу Нясвіжа. Пасля правядзення рэканструкцыі здадзены ў эксплуатацыю ўчасткі на дарогах Мінск — Маладзечна — Нарач, пад'езд да памежнага пераходу Новая Гута (Украіна). Уведзены ў будаўніцтва 2 пуцеправоды праз чыгуначныя шляхі — на дарозе Лепель — Полацк і ў раёне Жлобіна на дарозе Мінск — Гомель. У скарочаны тэрмін быў завершаны капрамонт аўтадарогі М-2 «Мінск — Нацыянальны аэрапорт Мінск». Блізкія да завяршэння работы па ўвядзенні запланаваных участкаў на дарогах Мінск — Магілёў, Мінск — Бабруйск, Мінск — Гродна і двух вялікіх мастах праз Заходнюю Дзвіну ў Верхнядзвінску і на абыходзе Віцебска.

Сёлета дарожнікі павінны скончыць і мадэрнізацыю аўтадарогі М-1/Е30 Брэст — Мінск — мяжа Расіі. Пры правядзенні гэтых работ прымяняліся новыя дарожныя тэхналогіі. У гэтым годзе па новай тэхналогіі нанясення абарончага слою на дарожнае пакрыццё «Новачып» укладзена 190 кіламетраў. Тэрмін службы такога дарожнага пакрыцця значна падоўжыцца.



**Святлана БАРЫСЕНКА.**
**Фота з архіва Дэпартамента «Белаўтадар».**

# ЕДЗЕМ У ВЁСКУ!

Акцыя «Звязды»:



## ЛЕПШАЯ ДОЛЯ? ЁСЦЬ!

**Рыба шукае, дзе глыбей, чалавек — дзе лепш. Рыгор, Ганна і маленькая Дар'я Прэдзеіны рашыліся сёлета на адказны ўчынак. З вёскі Баравая Буда Кармянскага раёна пераехалі ў вёску Галееўка Гомельскага. Ганна кажа, што маці адгаворвала, да гэтага часу плача: вяртайся дадому. Але ж жонка за мужам, як нітка за іголкай.**

Рыгор сваё рашэнне растлумачвае так. У КСУП «Чапаева», дзе 10 гадоў быў галоўным энергетыкам і інжынерам па ТБ, зарплата — 400 тысяч рублёў, а працаваў з раніцы да ночы. Жылля чакаў — не дачакаўся. Аднойчы ў газеце пабачыў запрашэнне на работу ў калгас «Урыцкае». Усё дасканала разведаў, з'ездзіў на месца, даведаўся аб перспектыве на жыллё, аб калектыве.

У красавіку сабралі яны рэчы і пераехалі. Дапамогу аказалі абласныя службы занятасці насельніцтва. Паводле дагавора, заключанага з кіраўніком прадпрыемства, маладой сям'і выплацілі больш за мільён 700 тысяч рублёў. Цяпер Рыгор працуе ў гаспадарцы «Урыцкае» электрыкам. Гаворыць, і ўмовы працы лепшыя, і зарплата большая. Падчас уборачнай атрымаў звыш мільёна рублёў.

Праўда, давялося паўтара месяца пажыць у мясцовым інтэрнаце — яго тут Артэкам называюць — пакуль засяліўся ў новенькі катэдж. Цяпер рамонтныя работы падыходзяць да фіналу і ўжо не сорамна паказаць жыллё з усімі выгодамі не толькі звонку, але і ўнутры. З жыўнасці ў іх пакуль толькі кот, але ж у планах — куры і парсюкі.

Ганне давялося мяняць не толькі месца жыхарства, але і прафесію. Была швачкай, стала свінаркай. Працаваць цяжка, але заробак — 700 тысяч рублёў, а не 50, як было чатыры гады таму, калі ішла ў «дэкрэт». Аднак галоўны матыў яе рашэння: усё для дзіцяці. Па-першае, Дашы тут прасторна, па-другое — да абласнога цэнтра рукой падаць.

Штогод у адпаведнасці з праграмай садзейнічання занятасці каля 50 сем'яў на Гомельшчыне становяцца перасяленцамі. Вось і сёлета 43 сям'і ўжо змянілі месца жыхарства. 18 рашыліся на пераезд з горада ў вёску, 24 — з адной вёскі ў другую, 1 — з горада ў горад. 10 сем'яў пераселена ў гаспадаркі іншых абласцей.

Намеснік начальніка камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Семіёнаў гаворыць, што нельга гэтую праграму называць праграмай перасялення з горада ў вёску. Звычайна з месца на месца пераязджаюць людзі з рэгіёнаў з устойліва высокім узроўнем беспрацоў'я, дзе складана працаўладкавацца. Менавіта такіх беспрацоўных перасяляюць туды, дзе ёсць праца і жыллё. З фонду сацыяльнай абароны выплачваюцца выдаткі, звязаныя з гэтым пераездам. Плюс дадаткова кожнаму беспрацоўнаму — «пад'ёмныя» — матэрыяльная дапамога да пяці бюджэтаў пражытковага мінімуму. Сёлета са сродкаў фонду беспрацоўным і членам іх сем'яў аказана матэрыяльная дапамога і выплачаны камандзіровачныя выдаткі ў суме большай, чым 57 млн рублёў.

Калі чалавек рашаецца штосьці змяніць у сваім жыцці, ён хоча, каб гэтыя перамены былі толькі ў лепшы бок. Многія імкнуцца з'ехаць з Гомельшчыны у так званыя чыстыя зоны — Віцебск, Мінск. У сельскую мясцовасць пры дапамозе службы занятасці часцей за ўсё пераязджаюць людзі ад 30 да 40 гадоў. Звычайна — невялікія сем'і. Ім лягчэй, чым шматдзетным: прыехалі, дом далі, перасяліліся. У асноўным гэта прадстаўнікі рабочых прафесій — даяркі, даглядчыкі жывёлы, палаводы, будаўнікі шукаюць лепшай долі і большага заробку. Таму што спецыялісты, як правіла, працу знаходзяць самі.

Ёсць і праблема, з якой час ад часу сутыкаюцца ў гаспадарках. Намеснік старшыні СВК «Урыцкае» Аксана Шандракова гаворыць, што кіраўнік абавязкова імкнецца загадзя даведацца як мага больш аб тых людзях, якія выказваюць жаданне пераехаць. Але ж здараюцца і праколы. Прыязджае чалавек на год у адпаведнасці з дагаворам, грошы атрымае, пакруціцца-пакруціцца, і далей шукае сабе прытулак у свеце. Зусім іншая справа — электрык Рыгор Прэдзеін. Толькі паўгода ў гаспадарцы, а працуе так, што на кожнай планёрцы начальнік яго ў прыклад іншым ставіць.

Перасяленне па праграме садзейнічання занятасці — не пажыццёвае рабства. Пасля абавязковай гадавой адпрацоўкі кожны робіць асабісты выбар: застацца ці не. Калі ёсць праблемы, чалавек заўсёды мае магчымасць вярнуцца на старое месца жыхарства, або зноў блукаць у пошуках месца пад сонцам.

Былі часы: горад прымаў з вёскі ўсіх. Сёння рух да цывілізацыі, з якой асацыюецца мегаполіс, магчыма, не такі буйны. Ён стрымліваецца вельмі празаічнымі прычынамі. Калі знайсці працу яшчэ магчыма, то набыць сваё жыллё ў буйным цэнтры далёка не кожнаму па кішэні.

А яшчэ — рух «да зямлі». Многія з тых, хто ў маладосці кінуў свае родныя сядзібы, пасталеўшы, адчуваюць імкненне вярнуцца да родных каранёў. А гэта можна зрабіць і без дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва. Проста па клічы душы. Тым больш што за апошнія гады тыя самыя прыдатныя ўмовы жыцця і так званыя выгоды перасталі быць нечым дзівосным для вёскі.

А Ганна Прэдзеіна з вёскі Галееўка Гомельскага раёна сёлета выкапае зусім невялічкі ўраджай морквы і буракоў — усё, што паспела пасадзіць побач з домам. Яна пакуль не вельмі ўпэўнена, што зможа хутка прывыкнуць да новага месца. Аднак, кажа, ёсць ужо суседзі, да якіх можна звярнуцца па соль. Лягчэй за ўсіх адаптавалася ў новых умовах дачка Даша — яна адразу знайшла сяброўак. Малая кажа: «Мама, тата, ну куды мы яшчэ паедзем, у мяне ж тут ёсць свой пакой!».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Даведайся пра падаткі!

Акцыя з такой назвай праходзіць на Гомельшчыне на працягу кастрычніка. Супрацоўнікі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці праводзяць рэйд па школах. І яго мэта — не выяўленне і пакаранне тых, хто ўтойваецца ад выплаты грошай, а асвета школьнікаў у пытаннях падатковага заканадаўства. Як падкрэслівае начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці Галіна Пашэд, «за мяжой асновы падатковых ведаў дзеці атрымліваюць яшчэ ў школе. Там выхаванне законапаслухмяных плацельшчыкаў пачынаецца з ранняга ўзросту. Пакуль жа ў нашай краіне такіх заняткаў у школьнай праграме няма». У дзесяці выбраных школах абласнога цэнтра пройдуць лекцыі, дзе настаўнікамі часова стануць службовыя асобы інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці і актывісты пярвічнай арганізацыі БРСМ гэтай структуры.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Пытальнік

## Бюджэты розныя. Магчымасці — таксама

*— Мы, жыхары горада Жодзіна, просім патлумачыць, чаму ў сталіцы пенсіянерам гэтай восенню была аказаная аднаразовая грашовая дапамога «на агародніну», а на перыферыі — не? Адкуль нераўнапраўе?*

*В.І. Саханевіч, Т.У. Камароўская, Т. Яшына, Н. Кулінковіч і іншыя (усяго 14 подпісаў).*

— Як патлумачыў «Звяздзе» намеснік **начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ**, сітуацыя тлумачыцца такім чынам. Грошы сталічным пенсіянерам «на агародніну» сёлета былі выдаткаваныя паводле рашэння Мінгарвыканкама, пры гэтым сама дапамога была прафінансавана выключна з бюджэту горада. У той жа час у Мінскай вобласці і іншых рэгіёнах такой магчымасці не знайшлося. Адпаведна, сталічныя пенсіянеры сапраўды аказаліся ў больш выйгрышным становішчы. Разам з тым, заўважыў Валерый Кавалькоў, ніякага парушэння заканадаўства тут няма — прымаць рашэнне аб дадатковай дапамозе тым ці іншым катэгорыям за кошт мясцовых бюджэтаў рэгіёны маюць поўнае права.

## УЗЯЎ. А ШТО ДАЎ?

**Летась пры садзейнічанні ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага гарвыканкама на пастаяннае, як мяркуецца, пражыванне ў сельскую мясцовасць пераехалі з абласнога цэнтра тры сям'і, сёлета за дзевяць месяцаў — дзве. Усе яны атрымалі працу, жыллё, фінансавую дапамогу. І што ж далей?**

У кожным упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ёсць звесткі аб наяўнасці вакансій і свабоднага жылля ў сельскагаспадарчых арганізацыях, прычым не толькі ў гэтым, але і ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Да прыкладу, на Гродзеншчыне на 1 жніўня гэтага года адпаведная інфармацыя паступіла з сямі раёнаў. У Гродзенскім раёне толькі адна гаспадарка паведаміла аб дзвюх вакансіях — жывёлавода і механізатара з зарплатай 300 тысяч рублёў і пражываннем у нядобраўпарадкаваных сельскіх дамах. Так, варыянты незайздросныя, ды і тых, як бачна, мізар. Забяспечанасць кадрамі на тых жа фермах тлумачыцца тым, што ў гэтым, самым эканамічна моцным раёне вобласці ўкараняюцца сучасныя тэхналогіі, якія скарачаюць залежнасць ад колькасці работнікаў.

Аднак значна большы выбар, а шмат дзе і больш прывабныя ўмовы па жыллі (нават добраўпарадкаваныя кватэры і дамы катэджнага тыпу) і зарплаце прапануюцца перасяленцам у іншых раёнах — Карэліцкім, Навагрудскім, Свіслацкім, Зэльвенскім. У некаторых сельгаспрадпрыемствах маецца нават больш за дзесяць, а то і дваццаць вакансій па самых розных спецыяльнасцях, прычым не толькі рабочых. Акрамя жывёлаводаў, трактарыстаў, вадзіцеляў, электрагазазваршчыкаў, патрабуюцца і ветэрынарныя ўрачы, аграномы, заатэхнікі, бухгалтары, эканамісты, інжынеры... Мінімальная зарплата — у палявода (220 тысяч рублёў), намесніку дырэктара па жывёлагадоўлі, галоўнаму бухгалтару і прарабу ў адной з гаспадарак абяцаюць 700 тысяч рублёў, а аператару машыннага даення ў сельскагаспадарчым філіяле прамысловага прадпрыемства — 750 тысяч рублёў.

Пры гэтым перасяленцам прадастаўляецца не толькі жыллё, але і фінансавая падтрымка з дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Беспрацоўным, якія заключылі адпаведны дагавор, выплачваюцца грошы ў памеры пяціразовай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (на сёння гэта 1 мільён 123 тысячы 500 рублёў). Калі ж у складзе сям'і некалькі беспрацоўных, то такая сума выдаецца кожнаму з іх пры ўмове заключэння дагавора і прадастаўлення гарантаванага рабочага месца. Плюс дадаткова грашовыя сродкі ў памеры аднаго бюджэту пражытковага мінімуму на кожнага іншага члена сям'і. Акрамя таго, беспрацоўнаму кампенсуюцца выдаткі па праездзе да месца знаходжання наймальніка і назад. А калі яны знайшлі паразуменне і заключылі дагавор, то кампенсуюцца і затраты па пераездзе ўсёй сям'і на новае месца жыхарства, уключаючы транспарціроўку маёмасці. Усе вышэйпамянёныя выплаты ажыццяўляюцца органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў тэрмін да пяці дзён з даты працаўладкавання беспрацоўнага ў адпаведнасці з дагаворам.

Такім чынам, людзям, якія па той ці іншай прычыне не здолелі асталявацца ў горадзе, даецца шанц: дзяржава прадастаўляе фінансавую падтрымку, а сельгаспрадпрыемствы прапануюць работу і жыллё. Аднак чаргі з ахвотнікаў перасяліцца ў сельскую мясцовасць ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага гарвыканкама няма. Паводле інфармацыі начальніка аддзела арганізацыі часовых работ, самазанятасці і перасялення Аляксандра Цівончыка, ахвотнікаў няшмат. Ды і тыя, хто заключыў дагавор і пераехаў на новае месца жыхарства, не заўсёды апраўдваюць надзеі наймальнікаў.

Летась з Гродна пры садзейнічанні службы занятасці пераехаў на Гомельшчыну мужчына, аднак не затрымаўся, а свайго новага адрасу там не пакінуў. У СВК «Макараўцы» Берастацкага раёна летась пераехала з двума дзецьмі жанчына — працавала на ферме, быццам усё было нармальна. Аднак... Тэлефануем у гаспадарку і даведваемся, што нядаўна яна прапала, а дзяцей, пакуль яе шукаюць, аддалі ў прытулак.

Не задаволены перасяленцамі з Гродна і старшыня сельгаспрадпрыемства «Новы Двор-Агра» Свіслацкага раёна Юрый Палтарак. Сям'і з двума дзецьмі прадаставілі добраўпарадкаваны дом, мужа і жонку ўладкавалі жывёлаводамі на ферме. Аднак пакуль іх паводзіны па вядомай прычыне ўжывання моцнаградусных напояў не даюць упэўненасці, што яны прыжывуцца на новым месцы. І можна зразумець крыўду старшыні гаспадаркі і на гэтыя кадры, і на службу занятасці, з чыёй «падачы» яны туды пераехалі. Хоць, з іншага боку, ніхто не прымушае да заключэння дагавора з гарадскім беспрацоўным, апошняе слова за кіраўніком прадпрыемства. Аднак паспрабуй адразу разбярыся, што гэта за людзі...

У падобных выпадках, калі ніякія меры не дапамогуць, наймальнік, зразумела, можа скасаваць дагавор з такім работнікам і звольніць яго. Адпаведна страчваецца і права на жыллё, паколькі яно з'яўляецца службовым. Да таго ж, калі перасяленец адпрацаваў на новым месцы менш за год і па няўважлівай прычыне звальняецца альбо яго звальняюць, то трэба будзе вярнуць дзяржаве атрыманыя ў якасці фінансавай падтрымкі грошы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Мяняю асфальт на зямлю!

### Гісторыя жанчыны, якая ў пошуках працы пакінула горад і стала вясковай жыхаркай



Мазалава — адно з самых маляўнічых мясцін Мсціслаўшчыны. На адным баку пагорка ўзвышаецца царква Ушэсця, пабудаваная ў першай палове XIX стагоддзя. Цяпер яна аднаўляецца. На другім баку — вялізны надпіс «Квітней, мой край», выкладзены пліткамі і камянямі.

Трэцяй славутасцю аграгарадка Мазалава нядаўна стаў адміністрацыйны будынак, пафарбаваны ў яркія зялёны і чырвоны колеры. У сельвыканкаме, які месціцца тут, хваляцца, што больш нідзе ў акрузе няма будынка ў колерах нацыянальнага сцяга.

Жылыя дамы ў некалькі паверхаў у пасёлку выглядаюць больш сціпла, затое маюць упрыгажэнне ў выглядзе сімпатычнага склада гарбузоў пад балконам і кветкавых клумбаў перад пад'ездамі.

Адна з актывістак добраўпарадкавання на Цэнтральным завулку — Ларыса Уладзіміраўна Сівакова. Старшыня Мазалаўскага сельскага Савета Леанід Пятровіч Падальхоў раіць усім жыхарам аграгарадка браць прыклад з жанчыны.

— Куды толькі мяне лёс ні кідаў, а прытулак знайшла ў Мазалаве і ні аб чым не шкадую, — усміхаецца Ларыса Уладзіміраўна.

Яна вырасла на Дрыбіншчыне, выйшла замуж за вайскоўца. Калі муж пайшоў з арміі, сям'я пасялілася на яго радзіме ў Мсціславе. Жылі, гадавалі сына і дачку, пакуль трагічнае здарэнне на дарозе не абарвала жыццё мужчыны.

Ларысе Уладзіміраўне трэба было жыць далей, але праблемы з працай не вырашаліся. Уладкавацца па спецыяльнасці ёй не ўдавалася: прафесія кандытара напрыканцы 1990-х не была запатрабаванай. Жанчына працавала падсобнай рабочай у прыватнай краме, і на атрыманыя капейчыны ледзь зводзіла канцы з канцамі.

І калі ёй прапанавалі працу ў сельскай гаспадарцы, яна не доўга разважала. Восем гадоў таму яна пераехала ў Мазалава і стала аператарам на адкорме мясцовага свінакомплексу.

— І не так страшна ў калгасе, як малююць, — гаворыць сёння працаўніца Сівакова. — А я сваю работу люблю...

Яна стала перадавіком працы і чацвёрты год запар займае першае месца ў Мсціслаўскім раёне па прывагах. Другі год атрымлівае рэспубліканскую прэмію за добрую працу, і яе партрэт ёсць на раённай Дошцы гонару.

Але трэба шчыра сказаць, што цяперашняя праца Ларысы Уладзіміраўны мала падобная на выраб торцікаў і булачак у чыстым кандытарскім цэху, дзе смачна пахне. На свінакомплексе СВК «Мазалаўскі» ідзе рэканструкцыя, і толькі яшчэ ў няблізкай перспектыве аператарам абяцаюць націсканне кнопак замест цяжкай ручной працы. Але Сівакова шукае ў сваёй рабоце не недахопы, а перавагі.

— Мы разам з напарніцай адкормліваем 750 свіней, — расказвае яна. — Я атрымліваю 350—400 тысяч рублёў у месяц, і штоквартальную прэмію за добрыя паказчыкі. Прэмія — гэта два парсючкі, якіх праз некалькі месяцаў можна здаць і атрымаць мільён рублёў.

Большая частка зробленых грошай ідзе на падтрымку дзяцей і ўнукаў. Як усе клапатлівыя маці, Ларыса Уладзіміраўна сцвярджае, што ў яе ўжо абсалютна ўсё ёсць, ды і пракарміцца ў вёсцы — няма праблем. На агародзе ў дзясятак сотак яна вырошчвае бульбу і ўсю агародніну. У хлеве трымае свіней і курэй. Лес поўны грыбоў і ягад.

— Мне падабаецца ў вёсцы — усё тут знаёмае і роднае, — гаворыць жанчына. — Я з пераездам у вёску нічога не страціла. І цывілізацыі цяпер у нашым аграгарадку не меней за горад. Крамы ў нас не горшыя. А калі нешта трэба адмысловае, то дабрацца на базар за дзясятак кіламетраў — гэта не праблема, транспарт ходзіць добра. А чым хадзіць у кіно, я лепей па плэеру пагляджу любую стужку і атрымаю задавальненне.

Ларыса Уладзіміраўна пакінула дом у раённым цэнтры сям'і сына, а гаспадарка выдзеліла ёй аднапакаёвую кватэру ў пасёлку з усімі выгодамі. Яна жыве тут адна з кошкай Дашай, якая не паказваецца незнаёмцам. Дзеці прыязджаюць у госці штотыдзень.

У свае 47 гадоў Ларыса Уладзіміраўна — прыгожая і стройная жанчына. Пасля працы ў агародзе яна замяніла штаны і гумавыя боты на спадніцу, пінжак ды яркую хустку, і зусім змяніла аблічча: з вясковай працаўніцы — на стыльную гарадскую спадарыню. Стрыманыя паводзіны, самастойны характар, добразычлівасць. Аднак замуж другі раз яна так і не пайшла: гаворыць, што адналюбка. Але, можа, усё яшчэ наперадзе?..

У Мазалаве, дзе цяпер жывуць амаль 700 чалавек, будуюць новыя домікі з усімі выгодамі: вадой, каналізацыяй, газам, цэнтральным ацяпленнем. Нездарма на іх у СВК «Мазалаўскі» стаіць чарга з маладых сем'яў, якія адсюль у гарады з'язджаць не хочуць. У сельскай гаспадарцы, якая лічыцца трывалай, знойдзецца праца. Таму і дэмаграфічная сітуацыя ў аграгарадку пайшла на паляпшэнне. Летась у Мазалаве нарадзілася 17 дзяцей, сёлета — ужо 12.

Старшыня сельскага Савета ўпэўнены, што мяжа паміж горадам і вёскай (прынамсі, аграгарадком) прыктычна сцёрлася. І яшчэ пры нашым жыцці давядзецца пабачыць, аптымістычна сцвярджае Леанід Падальхоў, як людзі пацягнуцца з гарадоў у сельскую мясцовасць: з душных кватэр, за якія трэба ўсё жыццё плаціць шмат грошай, да больш вольнага і здаровага ладу жыцця.

— Я сам вясковы чалавек, і я сабе іншага жыцця не ўяўляю, — гаворыць Леанід Пятровіч. — Я люблю зямлю, агарод. Я — паляўнічы і рыбак. А вялікія гарады — гэта не маё.

Чалавек — кансерватыўная істота, яму цяжка памяняць месца жыхарства, працу і лад жыцця. Падальхоў пераконвае, што далёка і не кожны гараджанін можа стаць добрым вясковым працаўніком. Тут патрэбна схільнасць да фізічнай працы, ды яшчэ са сваёй спецыфікай. Умоўна кажучы, не ўсе могуць гадаваць свіней.

Часта гараджан, якія нібыта не супраць пераезду ў сельскую мясцовасць, пужаюць невялікія заробкі ў аграпрамысловым комплексе. Столькі, колькі зарабляе перадавік на свінакомплексе ў глыбінцы, сёння атрымлівае прыбіральшчыца ў абласным цэнтры.

**ПАРАДЫ ПЕРАСЯЛЕНЦАМ У ВЁСКУ АД ВОПЫТНАЙ ЛАРЫСЫ СІВАКОВАЙ:**

1. Трэба працаваць і любіць зямлю, расліны і жывёл.
2. Добра стаўцеся да людзей, тады і яны ў адказ будуць вас паважаць.
3. Жывіце і атрымлівайце ад жыцця задавальненне.

Аднак часцей за ўсё сельская гаспадарка матэрыяльна заахвочвае сваіх работнікаў натуральнай аплатай — напрыклад, збожжам. Выгадна трымаць і падсобную гаспадарку, жывёлу. Зямлі даюць усім, колькі захочаш. Толькі працуй.

— Трэба быць гатовым да таго, што ў вёсцы давядзецца працаваць увесь светлавы дзень, — папярэджвае Леанід Пятровіч. — У добрага гаспадара заўсёды праца на падворку знойдзецца: ці то на агародзе корпацца, ці то ў хляве. Затое на свежым паветры і для душы, і аддача ёсць.

Старшыня сельскага Савета мяркуе, што Мазалаву яшчэ вельмі патрэбныя кавярня для моладзі і спартыўнае збудаванне, дзе можна хоць бы паставіць тэнісныя і більярдныя сталы. Мазалаўскія жанчыны гуляюць у школе ў валейбол, дзятва едзіць у Мсціслаў у басейн, а мужчыны засталіся без спартыўных забаў.

— І калі да нашай сферы з'явіцца, калі казаць агулам, яшчэ і культура жыцця, то будучае адназначна за вёскай, — заявіў Леанід Падальхоў. — Камп'ютары у нас ёсць, і да інтэрнэту падключаны. Талеркі спадарожнікавага тэлебачання вісяць на хатах. Мабільная сувязь працуе. І калі ёсць свой транспарт, дык і Магілёў з яго тэатрам не так далёка. Я думаю, што ў будучыні такіх перасяленцаў, як Ларыса Уладзіміраўна Сівакова, у нас будзе нашмат болей.

Так што зусім магчыма, што давядзецца Ларысе зноў пячы булачкі. На ўсіх.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Мсціслаўскі раён.*

## У Беларусі ў 2009 годзе плануецца перасяліць на новае месца жыхарства і працы 315 сем'яў беспрацоўных

**Дзяржаўная служба занятасці ў наступным годзе пасадзейнічае 315 сем'ям беспрацоўных у перасяленні (з іх згоды) на новае месца жыхарства і працы. Такая мера забеспячэння кадрамі працанедастатковых раёнаў прадугледжана праектам Дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2009—2010 гады, паведамілі ў галоўным упраўленні палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Паводле аператыўных даных, у студзені — верасні гэтага года на новае месца жыхарства і працы перасяліліся 287 сем'яў беспрацоўных (за аналагічны перыяд летась змянілі прапіску 208 сем'яў беспрацоўных). Сярод рэгіёнаў рэспублікі лідзіруючую пазіцыю па колькасці тых, хто перасяліўся, займае Віцебская вобласць (81 сям'я беспрацоўных). Дарэчы, сёлета са сталіцы на перыферыю перасяліліся 6 сем'яў беспрацоўных.

Перасяленне ажыццяўляецца пераважна ў сельскую мясцовасць. Рэалізацыя гэтага накірунку дзейнасці дзяржслужбы занятасці садзейнічае пераразмеркаванню працоўнай сілы на лакальных рынках працы.

Як паказвае практыка, у найбольшай ступені зацікаўлены ў пераездзе на новае месца жыхарства і працы сем'і з няпоўнагадовымі дзецьмі. Трэць сем'яў перасяленцаў мяняе прапіску ў межах адной вобласці, астатнія пераязджаюць у іншы рэгіён краіны. Большасць сем'яў перасяляюцца па маршруце «вёска — вёска». Дзяржаўнай праграмай садзейнічання занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2008 год устаноўлена планавае заданне па перасяленні з выплатай грашовай падтрымкі і кампенсацыяй выдаткаў на пераезд 305 сем'яў беспрацоўных.

Пераразмеркаванне працоўных рэсурсаў па рэгіёнах з улікам рэальных патрэбнасцяў у працоўнай сіле, павышэння тэрытарыяльнай мабільнасці вясковага насельніцтва — вельмі важныя аспекты рэгулявання сітуацыі на рынку працы. Таму, праінфармавалі ў міністэрстве, плануецца ўнесці змяненні ў дзеючае заканадаўства па ўзмацненні матэрыяльнага стымулявання беспрацоўных да пераезду ў працанедастатковыя рэгіёны, і ў першую чаргу, з горада ў вясковую мясцовасць.

Нагадаем, летась былі павялічаны памеры матэрыяльнай дапамогі перасяленцам з малых і сярэдніх гарадоў з высокай напружанасцю на рынку працы.

Беспрацоўнаму жыхару праблемных у дачыненні да занятасці населеных пунктаў пры перасяленні выплачваецца аднаразовая дапамога ў памеры 7 бюджэтаў пражытковага мінімуму (БПМ), а не 5 БПМ, як астатнім беспрацоўным, якія перасяляюцца. Прычым выплата гэтых 2 дадатковых БПМ датычыцца кожнага беспрацоўнага члена сям'і перасяленцаў. Для даведкі: памер бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка — Br224 тыс. 700.

Незалежна ад месца пражывання перасяленцаў выдзяляецца дапамога ў памеры яшчэ аднаго БПМ на кожнага члена сям'і, які перасяляецца. Акрамя таго, за сродкі службы занятасці беспрацоўных камандзіруюць да магчымага будучага наймальніка для азнаямлення з новым месцам жыхарства і працы. Кампенсуюць таксама выдаткі на пераезд (аплата кошту праезду, перавозкі маёмасці, сутачныя за час знаходжання ў дарозе).

Фінансаванне на гэтыя мэты са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацабароны прадугледжана на 2008 год у памеры Br676,3 млн.

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

**У мінулым масавы сыход жыхароў вёскі ў горад быў выкліканы калектывізацыяй — быць калгаснікамі моладзь не хацела. Адваротны працэс за савецкім часам неназіраўся, а якая сітуацыя сёння?**

## Горад вяртае людзей...

Гараджан заманіць у вёску можна толькі лепшымі ўмовамі жыцця. А стварыць такія ўмовы чалавеку можа далёка не кожная гаспадарка.

Вось і давялося патэлефанаваць у гаспадаркі Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў, бо ў цэнтрах занятасці сказалі, што не памятаюць ніводнага выпадку за апошнія гады, каб нехта пераехаў на пастаяннае жыццё ў вёску.

У аддзеле кадраў сельгаскамбіната «Мір» доўга шукалі такіх людзей і не знайшлі. Праўда, 10 гадоў таму адна жанчына прыехала з Баранавічаў, але сёння яна пенсіянерка і такі выпадак можна лічыць выключэннем.

Пазваніў у ААТ «АграСэрвіс-Стандарт», што ў пасёлку Гарадзішча, і пачуў: з горада ў іх працуе толькі адзін чалавек на пасадзе юрыста — прыйшла маладая дзяўчына. Прадпрыемства запрашае на працу даярак, жывёлаводаў, майстра-будаўніка...

— А якія людзі да вас прыходзяць, як адбіраеце?

— О-о-о, тут выбіраць не даводзіцца, — уздыхнулі ў трубку.

А вось якая сітуацыя ў сельгаскааператыве «Ляхавіцкі».

— У нас людзей, якія вярнуліся з горада, няма, бо ўсе рабочыя месцы займаюць свае. Калі ў гаспадарцы прыстойны заробак, а яшчэ можна атрымаць і жыллё, то праблем з кадрамі няма. Людзі ўсе навідавоку і ты ведаеш — хто ёсць хто — гэта па-першае, а па-другое, калі чалавек не знайшоў месца ў горадзе, то ўзнікае пытанне: а які ён спецыяліст? Ці, можа, у яго ёсць шкодныя звычкі? — выказаўся старшыня гаспадаркі А. Вітко.

Гаворка ў нас ідзе не пра тых, хто пайшоў з вёсак вучыцца, напрыклад на агранома ці настаўніка, а затым вярнуўся назад. Цікавасць выклікаюць гараджане, якія перабраліся з горада ў вёску працаваць, бо здараецца, што пенсіянеры пераязджаюць, але тут нічога надзвычайнага няма — пажыць на схіле жыцця на прыродзе ды сваім агародзе і пры пенсіі — сітуацыя зразумелая.

Ёсць і тыя, хто ездзіць працаваць у бліжэйшыя ад горада гаспадаркі, асабліва калі там стабільная зарплата. Але зноў жа, сем'і іх жывуць у горадзе і сувязь з вёскай у такім выпадку нетрывалая. Сёння працую тут, а заўтра — назад у горад.

І ўсё ж тых, хто перабраўся з горада, хапае, але, у сваёй большасці, гэта людзі, якія апынуліся на абочыне жыцця.

У мінулым вёску пакідала найперш моладзь актыўная. Нехта паступаў вучыцца ў інстытуты і тэхнікумы, а хтосьці набываў спецыяльнасць у ПТВ і заставаўся ў горадзе. Многія і з войска ўжо не вярталіся ў вёску.

А апошнім часам горад аддае вёсцы сваіх жыхароў, тых, з якімі савецкая ўлада няньчылася, бо тады хто не працаваў, трапляў у катэгорыю дармаедаў, а гэта ўжо крымінальны артыкул.

У вёску вяртаюцца мужчыны, якія пакінулі сем'і і цяпер жывуць у бацькоўскіх хатах. Жыццё прывязана да гарэлкі і нават у сельгаскааператывах для іх работы няма, а найчасцей і самі не хочуць працаваць.

Жыве такі перасяленец у хаце, а хлеў разбірае на дровы, але не нарыхтоўвае іх — адпілуе ад бервяна калодку, пасячэ на палены ды прапаліць грубку, а назаўтра ўсё спачатку.

Пакідаюць горад і сем'ямі. Тых, хто жыве ў горадзе і гадамі не плаціць за кватэры хапае, але бясконца так цягнуцца не можа. Вось адзін прыклад.

Гаспадыня з дачкой і двухгадовай унучкай жыла ў трохпакаёвай кватэры, і неўзабаве ў жанчыны з'явіўся сужыцель. А калі за кватэру накапілася вялікая сума нядоімкі і паўстала пытанне аб высяленні, то сужыцель узяўся выплаціць доўг, а для сям'і паабяцаў купіць хату ў вёсцы. На гэтым і дамовіліся.

Пад Баранавічамі сужыцель купіў за 2 тыс. долараў хату, у якую сям'я і пераехала, а сам застаўся жыць у кватэры.

Мне часта даводзіцца бачыць гэтых перасяленцаў. Наўкол хаты зелле ў рост чалавека, плот паваленны і нічога не пасаджана. Хоць бы нейкае каліва цыбулі ці корч бульбы — пуста. Жанчыны некуды цягнуцца ў вёску, затым да іх ідуць такія ж, п'юць гарэлку, а дзіця бывае кінутым.

«Што яны ядуць, на што жывуць? А што зімой рабіць будуць?» — пытаюцца суседзі. Нейкія меры трэба было б прымаць, бо ў такіх умовах дзіця гадаваць нельга. Іншым разам думаю, што можа мне патэлефанаваць у сацыяльную службу, але ўмешвацца ў чужое жыццё...

Змянілася сацыяльна-эканамічная сітуацыя і пэўная катэгорыя людзей аказалася не прыстасаванай да новых умоў, да барацьбы за выжыванне.

У вёсцы некалькі лягчэй, хоць за жыллё не трэба плаціць, а які там сельгаскааператыў, былых гараджан гэта не турбуе, бо ім не да працы.

Здараецца, што ў сельскай мясцовасці апынаюцца і дзелавыя людзі. «Прагарэў» адзін індывідуальны прадпрымальнік і каб разлічыцца з даўгамі, прадаў усё, што меў. Затым набыў на ўскрайку вёскі хату і стаў фермерам.

Ці знаёмая жанчына, кандыдат навук, жыла ў Маскве, але адтуль вярнулася з дзецьмі да бацькоў і цяпер кіруе доследнай сельгасстанцыяй.

І такіх людзей аддае горад, але яны аселі ў вёсцы з нагоды выключных абставінаў, якія і падштурхнулі іх да міграцыі.

Безумоўна, нейкі спецыяліст і спакусіцца на асобны дом у аграгарадку, але і там у чарзе на жыллё, найперш, стаяць свае работнікі. А бывае, што новыя дамы пустуюць...

З якога боку тут ні глядзець, але сур'ёзнага перасялення з горада ў вёску не назіраецца.

Магчыма, мае высновы і песімістычныя, але так склалася жыццё. Нельга адмаўляць, што дзесьці ў нейкім рэгіёне сітуацыя некалькі іншая, але агульная тэндэнцыя прагладваецца.

Калі ва ўсе нашы гаспадаркі прыйдуць сучасныя тэхналогіі, то можа і адпадзе пытанне аб міграцыі насельніцтва з горада ў вёску, бо ў эканамічна развітых краінах у сельскай гаспадарцы працэнт насельніцтва заняты значна меншы. Ёсць над чым працаваць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Познія апенькі... І апошнія баравікі

*Вось і дачакаліся апенек і зялёнак. Хоць на рынку апошніх хапае, але першынство ўсё ж за апенькамі.*

*Сёлета летніх не было, а восеньскія нясуць з лесу кашамі. З цёмнымі капялюшыкамі і тоўстымі ножкамі яны выглядаюць эфектна.*

*Але найбольш прыцягваюць да сябе баравікі. Бардовыя і светлыя, маленькія і вялікія — баравікамі ў кастрычніку можна любавацца доўга. За вядро (10 літраў) апенек просяць 12 тысяч, зялёнкі ўдвая таннейшыя, а баравікі, вядома, самыя дарагія — 20 тысяч рублёў.*

*Надвор'е апошнія дні стаіць цудоўнае і трэба неадкладна зазірнуць у лес — жыццё такое мімалётнае.*

***Сымон СВІСТУНОВІЧ.***

***Фота аўтара.***



Ёсць выбар!

Тваё правы

# Бясплатная кватэра: якія варыянты?


Фота Пятра ФАМІНА.

**Папрацаваў — і атрымаў кватэру. На жаль, гэта вядомая ў «савецкія» часы практыка па сутнасці засталася ў мінулым. Сёння магчымасці прадастаўлення бясплатнага жылля зведзены да мінімуму — стаўка робіцца на будаўніцтва з крэдытамі. І тым не менш пэўныя варыянты ўсялення ў службовую або сацыяльную кватэру захаваліся. Якія? Зрэшты, аб гэтым — наша гутарка з намеснікам загадчыка юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Васілём Мікалаевічам КОРСУКАМ.**

**ЗА КАГО МАГЧЫМА ПАХАДАЙНІЧАЦЬ?**

Як вядома, раней атрыманне службовага жылля найперш залежала ад спецыяльнага пераліку прафесій і пасад. Аднак сітуацыя змянілася пасля 19 сакавіка мінулага года. З гэтага часу пералік скасаваны. Затое з'явіліся іншыя ўмовы — былі вызначаны катэгорыі грамадзян, якія маюць права на атрыманне службовых жылых памяшканняў. І, апроч таго, былі прадугледжаны структуры, якія могуць такія памяшканні прадастаўляць.

— У прыватнасці, адна з такіх структур — Савет Міністраў, — адзначае Васіль Корсук. — Пры наяўнасці важкіх прычын дзяржаўныя органы і іншыя дзяржарганізацыі могуць звяртацца з хадайніцтвам ва Урад з просьбай прадаставіць службовае жыллё тром катэгорыям грамадзян. Па-першае, маладым спецыялістам, якія навучаліся «на бюджэце» і пачалі працаваць па размеркаванні. Па-другое, работнікам арганізацый, што знаходзяцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання больш за 5 Кюры і прыроўненых да іх тэрыторый. І па-трэцяе, асобам у выпадку пераезду з іншага населенага пункта пры прызначэнні на пасаду або ў выпадку пераводу ад аднаго наймальніка да другога ў сувязі з абгрунтаванай вытворчай ці эканамічнай неабходнасцю. Праўда, калі маецца на ўвазе перавод, то тут спатрэбіцца пацвердзіць, што ў дадзеным населеным пункце знайсці паўнавартасную замену «запрошанаму» спецыялісту немагчыма.

Плюс да таго, яшчэ адзін орган, праз які прадастаўляецца службовае жыллё — гэта аблвыканкам. Хадайніцтвы сюды падаюцца ў дачыненні да грамадзян, якія пражываюць у вёсцы і працуюць у сельгасарганізацыях або ў іншых арганізацыях, што абслугоўваюць гэтую галіну, а таксама ў дачыненні да работнікаў санаторыяў і рэабілітацыйных цэнтраў — зноў-такі, калі падобныя ўстановы размешчаныя ў сельскай мясцовасці.

— Без уліку ўсяго сказанага вышэй службовае жыллё можа прадастаўляцца толькі суддзям, пракурорскім работнікам, ваеннаслужачым, супрацоўнікам міліцыі, органаў фінансавых расследаванняў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях — за выключэннем ваеннаслужачых-тэрміноўшчыкаў і курсантаў, — заўважае Васіль Корсук. — Пры гэтым, што да суддзяў і пракурорскіх работнікаў, то тут заканадаўства прадугледжвае — яны павінны атрымаць службовыя кватэры не пазней чым праз 6 месяцаў пасля прызначэння на пасаду або пастаноўкі на ўлік для паляпшэння жылёвых умоў.

**ЁСЦЬ УЛАСНАСЦЬ — НЯМА ПЫТАННЯЎ**

Варта заўважыць, што дагэтуль гаворка ішла аб работніках дзяржаўных органаў ці арганізацый. Разам з тым паспрыяць работнікам у вырашэнні галоўнага пытання могуць і арганізацыі іншых формаў уласнасці. Калі такія арганізацыі маюць свой жылфонд, то ва ўласніка ёсць права жыллё з гэтага фонду адчужаць, прадаваць або здаваць у адпаведнасці з дагаворам найму.

**ВА ЎЛАСНАСЦЬ УЖО НЕ АФОРМЯЦЬ**

Не менш папулярнае пытанне датычыцца варыянтаў прыватызацыі службовага жылля. Да пачатку гэтага года, паводле пісьмовай заявы, аформіць жыллё ва ўласнасць маглі некаторыя прадугледжаныя заканадаўствам катэгорыі грамадзян — у прыватнасці, грамадзяне, якіх выселіць са службовых памяшканняў без прадастаўлення «замены» было нельга. Да прыкладу, гэта інваліды I і II груп, інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, грамадзяне, звольненыя ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі і па скарачэнні штатаў, асобы, якія атрымалі цяжкую вытворчую траўму або прафзахворванне, ці асобы, якія адпрацавалі ў арганізацыі не менш за 10 гадоў. Аднак цяпер сітуацыя змянілася — прыватызаваць службовае жыллё ўжо немагчыма. Як, да слова, не падлягае прыватызацыі і сацыяльнае жыллё.

**З ДАХОДАМ АБО НЕ?**

Аб сацыяльным жыллі — размова асобная. Фактычна прадастаўляць яго могуць як арганізацыі, так і выканкамы. Аднак у сапраўднасці гэта робяць толькі апошнія.

— Увогуле пры прадастаўленні сацыяльнага жылля нашы грамадзяне падзеленыя на дзве групы, — кажа Васіль Корсук. — Да першай з іх адносяцца пэўныя катэгорыі, якія могуць разлічваць на дзяржаўную кватэру з улікам даходаў. Да такіх катэгорый адносяцца інваліды I і II груп; грамадзяне, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў, якім пры паўторным аглядзе вызначана III група або якія прызнаныя ва ўстаноўленым парадку дзеяздольнымі; пенсіянеры (мужчыны ва ўзросце 60 і жанчыны ва ўзросце 55 гадоў); сем'і з дзецьмі-інвалідамі; шматдзетныя сем'і, маці, якім прысвоена званне Маці-гераіня ці якія маюць ордэн Маці, ордэн Мацярынскай славы або «Медаль мацярынства»; грамадзяне, якія ўзялі на выхаванне 3 і больш дзяцей-сірот ці дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі; ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў і члены сем'яў ветэранаў вайны, якія загінулі або памерлі. Прычым вызначана: сярод гэтых катэгорый права на сацыяльную жылплошчу маюць толькі тыя, у каго на кожнага члена сям'і атрымліваецца даход ніжэй за сярэдні бюджэт пражытковага мінімуму (на сёння гэта крыху больш за 224 тыс. рублёў) за апошнія 12 месяцаў перад пастаноўкай на ўлік і на дзень прадастаўлення жылля, а таксама хто валодае маёмасцю, якая не перавышае кошт будучай кватэры.

Не сакрэт, што менавіта **«планка даходаў» — умова часта невыканальная. Сёння ўзровень БПМ перавышае нават пераважная большасць пенсій. Таму асноўнымі атрымальнікамі сацыяльнага жылля становяцца іншыя — тыя, хто можа разлічваць на яго без спасылак на ўласны ўзровень дабрабыту.**

— У прыватнасці, без уліку даходаў такое права прадугледжана для грамадзян, жылыя памяшканні якіх сталі непрыдатнымі для карыстання ў выніку надзвычайных сітуацый; грамадзяне, якія маюць вызначаныя спецыяльным пералікам Міністэрства аховы здароўя захворванні, пры наяўнасці якіх немагчыма сумеснае пражыванне ў адным пакоі ці ў аднапакаёвай кватэры, грамадзяне, якія маюць дзяцей з такімі захворваннямі; дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі; Героі Беларусі, СССР, Сацпрацы, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы; ветэраны і інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў; ваеннаслужачыя, асобы радавога і кіруючага складу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, знявечання або захворвання пры выкананні службовых абавязкаў; інваліды з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, знявечання, звязаных з баявымі дзеяннямі падчас Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў; грамадзяне, якія перанеслі прамянёвую хваробу ў выніку катастрофы на ЧАЭС і інваліды-чарнобыльцы, — адзначае Васіль Корсук. — Пры гэтым літаральна з 7 кастрычніка ў гэты пералік увайшлі таксама непрацуючыя адзінокія інваліды I і II груп, а таксама непрацуючыя адзінокія пенсіянеры — мужчыны, якія дасягнулі ўзросту 60, і жанчыны, якія дасягнулі ўзросту 55 гадоў.

**Сяргей ГРЫБ.**

Карэспандэнт высвятляў сітуацыю

# ЦІ ДАКЛАДВАЮЦЬ ІЛЬВУ МЯСА?



**— Да сыты ён, гэты леў! І ўсім нашым звярам — а ў нас цяпер прадстаўнікі 50 відаў, стараемся стварыць камфортныя ўмовы! Вальер, «кватэра» льва, адрамантаваны, — запэўнівае дырэктар віцебскага заапарка.**

**— Ды не, былі выпадкі — галадаў! І не толькі леў! І холадна некаторым звярам, і цесна — гавораць былыя работнікі заапарка, якія скардзяцца на дырэктара ў розныя інстанцыі. Ёсць у іх і аднадумцы сярод тых, хто яшчэ там працуе. Усе незадаволеныя прасілі свае прозвішчы ў матэрыяле не ўпамінаць.**

**Адразу міжволі ўспамінаецца знакаміты маналог Генадзя Хазанава. Памятаеце: папугай расказваў пра цяжкае жыццё ў заапарку. На жаль, гумару ў гэтым матэрыяле не будзе. Канфлікт паміж дырэктарам і ягонымі падначаленымі стаў тэмай журналісцкага расследавання «Звязды».**

Спачатку ў віцебскі карпункт з незвычайнай просьбай звярнулася 75-гадовая пенсіянерка Марыя Рыгораўна Плавінская.

— Я ў свае маладыя гады (смяецца) хачу, каб усім было добра. Людзей люблю і звяроў. Калі каму дрэнна, не магу на гэта не звярнуць увагі. А тут такая складаная сітуацыя. Вельмі прашу вас, разбярыцеся, калі ласка. Трэба, каб далі нармальна працаваць маладому дырэктару заапарка і калектыву, бо ім толькі і прыходзіцца, што адбівацца ад гэтых скаргаў і праверак. На жаль, тыя, хто скардзяцца, не хочуць бачыць добрага. — гаворыць пенсіянерка — маці двух сыноў і дачкі, бабуля дзвюх унучак і ўнука. — Я вось з 12-гадовай унучкай год таму прыйшла ў заапарк. Потым таксама паскардзілася ў мясцовую газету, бо шкада стала звяроў, якіх утрымлівалі ў вельмі дрэнных умовах — цесных вальерах і клетках. Тады яшчэ цяперашні дырэктар малады калектывам не кіраваў. Звяры выглядалі так, што слёзы з вачэй каціліся. Я тады нават 20 тысяч з пенсіі пералічыла на рахунак заапарка. Праз некаторы час добрыя змены там адбыліся. Новы дырэктар здолеў для гэтага правільна арганізаваць работу калектыву. Чысціня паўсюды, парадак, новыя звяры. Розныя забаўляльныя акцыі праводзяць. Няўжо гэта дрэнна?

— Не ўсё так добра, як здаецца на першы погляд, — у адзін голас запэўнівалі мяне незадаволеныя дзейнасцю дырэктара. — Заапарк — не забаўляльны цэнтр, тут у першую чаргу неабходна стварыць добрыя ўмовы для пражывання звяроў. Ды і да падначаленых, якія сумленна працуюць, дырэктару трэба ставіцца з павагай. А кіраўнік клапоціцца толькі пра лічбавыя вытворчыя паказчыкі ў рабоце. З тымі, у каго іншы погляд на тое, як трэба клапаціцца пра жывёл, размова ў яго кароткая. Маўляў, не падабаецца нешта, звальняйцеся. Ды кантракты з такімі не працягвае. Грубы чалавек. Факты, што мы сабралі, гавораць пра тое, што не любіць насамрэч ён звяроў. Мы ж не проста гэта заяўляем, вось фотаздымкі, паглядзіце.

Мне паказалі фота тхара, які... памёр з-за таго, што ў службовым пакоі дырэктара яго не кармілі (так сказалі апаненты дырэктара). Адзначылі, што ўзяў звера, каб паказаць гасцям, ды забыўся, што даглядаць яго трэба...

А вось выява дзвюх малпаў, якія сядзяць у цесных клетках у халодным памяшканні без цяпла. Яшчэ адна жудасная фатаграфія — драпежныя птушкі ў... акварыумах і каробках.

— Толькі потым, калі мы запрасілі арнітолага, некаторых птушак выпусцілі. Нават сюжэт па тэлебачанні пра гэта паказалі. На жаль, за кадрам засталося, што не ўсе птушкі дажылі да гэтага моманту.

Дырэктар на гэты конт адзначае, што выпусцілі на волю тых птушак, хто мог выжыць. Так, і без смерці не абышлося, але птушка была хворая.

Пра цара звяроў. Незадаволеныя канстатавалі, што дырэктар прымушаў рабочых карміць ільва фаршам, які непрыдатны для ўжывання.

— Мы льву з-за гэтага непрыдатнага фаршу курэй давалі...

— Ну дык і што тут дрэннага? — цікаўлюся.

— Ды не хапала льву гэтага. Яму ж кілаграмаў 10 мяса штодня трэба. А што такому велікану тыя куры?

Паводле слоў аўтараў скаргаў, замест таго, каб рамантаваць і будаваць вальеры і клеткі для жывёл, дырэктар вельмі клапоціцца пра рамонт службовых пакояў адміністрацыйнага будынка.

Пры гэтым не хоча нават у падарунак прыняць нешта, каб свае жыллёвыя ўмовы палепшылі жывёлы.

— Вось чалавек адзін прыехаў з Віцебскага раёна, — расказвае чарговы змагар за правы жывёл заапарка. — «Ёсць у мяне вальер для трусоў. Бярыце, толькі прыязджайце за ім самі». Не, дырэктару чамусьці не да гэтага.

Мае суразмоўцы адзначылі, што падчас акцыі для дзяцей дырэктар запрасіў збоку людзей, якія прыехалі на конях. Безумоўна, каб пакатаць дзяцей. Але не ўзгадніў візіт «чужых» звяроў з ветэрынарнай службай горада, што катэгарычна забаронена. Дырэктар пракаментаваў гэта: катанне вялося па набярэжнай Заходняй Дзвіны за тэрыторыяй заапарка. А ўся акцыя была ўзгодненая з кіраўніцтвам аддзела культуры.

Далі мне пачытаць і афіцыйныя адказы чыноўнікаў на скаргі. Вось кіраўнік аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама (гэтай інстанцыі падпарадкоўваецца заапарк) піша наступнае. Цытата са скарачэннямі ў перакладзе з рускай мовы: «Некаторыя факты, выкладзеныя ў звароце, мелі месца... Загадам аддзела культуры ад 23 чэрвеня 2008 года Андрэйкаву А.А. аб'яўлена заўвага і паўторна ўказана на выключэнне з метадаў работы грубасці і хамства ў дачыненні да супрацоўнікаў і наведвальнікаў. Па факце рэвізіі фінансава-гаспадарчай дзейнасці загадам аддзела культуры ад 9 верасня 2008 года дырэктар дэпрэміяваны. Андрэйкаву даведзеныя да ведама ўказаныя ў звароце недахопы ў рабоце заапарка, указана на неадкладнае іх рашэнне. У мэтах паляпшэння работы заапарка і мікраклімату дырэктару прапанавана прымяніць у рабоце такія якасці, як тактоўнасць і талерантнасць. Выказана неабходнасць прытрымлівання этыкі службовых адносінаў. У сітуацыі, якая склалася, з дырэктарам працягнуты кантракт тэрмінам на адзін год з умовай устаранення вышэй пералічаных заўваг».

Яшчэ ў адным адказе адзначана, што дырэктару аб'яўлена заўвага.

У той жа час пастаянным наведвальнікам заапарка, што заходзілі ў заапарк да змены кіраўніцтва, адназначна бачныя плюсы. Прадпрымальнікі па просьбе дырэктара камерцыйную кавярню на колах прывозяць, таксама арганізуюць пракат дзіцячых аўтамабіляў, і надзіманая горка вельмі падабаецца дзятве. У самім заапарку таксама ёсць такі атракцыён, толькі маленькі вельмі. У Кнізе водгукаў і прапаноў толькі адна скарга на грубасць касіра. Апаненты адзначаюць, што ёй перашкаджае працаваць гучная музыка, якая раздаецца побач з дынамікаў. Астатнія запісы — толькі словы ўдзячнасці за карпатлівую работу, цікавыя акцыі, якіх раней не праводзілі. У прыватнасці, акцыя БРСМ у Дзень Незалежнасці, тыдзень бясплатнага ўваходу для дзяцей і іншыя стварылі ўстанове добрую рэпутацыю месца, дзе цікава можна правесці час сем'ям. Пры ўсім гэтым больш чым у два разы павялічыўся прыбытак. Даходы ад усіх відаў дзейнасці плюс 40 працэнтаў. Панізілі выдаткі ў тым ліку дзякуючы ўкараненню энергазберагальных тэхналогій. Колькасць наведвальнікаў павялічылася прыкладна на 17 тысяч. Пляцоўку для катання на электрычных машынах адрамантавалі, каруселі спраўна працуюць. Білет на апошнія — усяго 600 рублёў. Памер заробку павялічыўся болей чым на 30 працэнтаў. Менавіта гэты плюс падкрэслілі, дарэчы, супрацоўнікі заапарка, з якімі я пагутарыў. Праўда, апаненты ўпэўненыя, што зусім гэта не паказальна, бо ва ўсіх працуючых у краіне зарплаты павялічыліся.

— Ды добры ў нас дырэктар! Вось бачыце, абутак для работы выдалі, а раней у сваім даводзілася працаваць, — расказвае рабочая па доглядзе жывёл Любоў Мікалаеўна Курылёнак, якая і льва корміць таксама. — Рамонт у падсобным памяшканні для рабочых зрабілі. Вось, глядзіце, мікрахвалевая печ. Хто хоча працаваць — будзе, а інтрыгі, скаргі... Я такога не разумею.

— Я ўжо гадоў шэсць тут працую, — расказвае білетны касір Таццяна Адамаўна Мажароўская. — Я пенсіянерка, а не магу сядзець дома. Клапоціцца дырэктар пра калектыў. Вось да Дня работнікаў культуры прэмію атрымалі. А матэрыяльная дапамога на набыццё бульбы — таксама прыемна... Я ж бачу рэакцыю наведвальнікаў. Калі бацька просіць дзіця пайсці дадому, а малы ўсё хоча яшчэ трохі пабыць. Гэта ж паказальна!

Дырэктар Аляксей Андрэйкаў займае сваю пасаду з сярэдзіны кастрычніка мінулага года. Між іншым, і былым кіраўніцтвам не ўсе былі задаволеныя. А варта адзначыць, што дзякуючы менавіта эксдырэктару Жанеце Качаноўскай і з'явіўся ў Віцебску спачатку тэатр звяроў, а потым ён пераўтварыўся ў заапарк. Гэтая жанчына ў сярэдзіне 1980-х пасля работы ў цырку разам з мужам Паўлам прывезла ў правінцыйны горад звяроў. Леў, якому цяпер ужо за 20 гадоў, вярблюд, малпы... жылі ў непрыстасаваным памяшканні будынка, што побач з тэрыторыяй сённяшняга заапарка. Па мінімуму, на жаль, дапамагалі гэтым энтузіястам улады. Грошай хапала, каб выжыць, толькі ніяк не развівацца царству жывёл. Дык вось, калі прызначылі Аляксея Андрэйкава дырэктарам, яна працавала на пасадзе намесніка. Ды разышліся ў метадах работы. Мо і з-за таго, што адзначаюць цяперашнія незадаволеныя.

Чарговаму дырэктару 30 гадоў. Па адукацыі ветэрынар. З «чырвоным дыпломам» скончыў аграрны каледж. Расказаў, што калі вучыўся ў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, паралельна працаваў у галіне ветэрынарыі. Па размеркаванні паехаў у Магілёўскую вобласць — у Хоцімскі раён, дзе ад пасады звычайнага ветурача дайшоў да дырэктара раённай племяннай станцыі. Тры гады таму зноў у акадэміі — быў ардынатарам клінікі, асістэнтам кафедры паразіталогіі. Займаўся грамадскай дзейнасцю — у якасці намесніка сакратара пярвічнай арганізацыі БРСМ. Менавіта па рэкамендацыі БРСМ і накіраваны ў заапарк. Жанаты, ёсць маленькае дзіця.

Дырэктар сказаў, што пастаянна прыходзілі ў заапарк розныя адказныя асобы і правяраючыя і нічога такога асаблівага, што можа пацвердзіць скаргі, не знаходзілі. Ніякіх звяроў ён не крыўдзіў. Адзначыў, што некаторыя актывісты скаргамі і папярэдніка дырэктара «даставалі». Наконт пазбаўлення прэміі і заўвагі — пракаментаваў, што ўсё гэта прадказальны вынік разгляду скаргі на больш высокім узроўні. Вядома ж, трэба было неяк адрэагаваць. Хоча, каб заапарк стаў сапраўдным сучасным цэнтрам сямейнага адпачынку. Поўны планаў наконт развіцця ўстановы, якой кіруе. Многае ўжо зроблена па рамонце жылля звяроў. Праўда, адразу ўсё, што трэба, зрабіць немагчыма. Лічыць, незадаволеным трэба лепш выконваць свае службовыя абавязкі і сачыць у першую чаргу за сабой...

Ну, што адзначыць напрыканцы? Уявім, прызначаць новага дырэктара. Няўжо ён будзе адпавядаць патрабаванням усіх супрацоўнікаў? Наўрад ці. Зразумела, галоўнае, каб звярам было ўтульна ў заапарку. І нельга сказаць, што кіраўнік зусім пра гэта не клапоціцца. Ён мяркуе, што ў першую чаргу трэба вырашаць задачы, што здаюцца яму актуальнымі. Некаторыя ўпэўнены, што траціць тыя ж грошы ад даходаў трэба зусім па-іншаму. Папугаі ў клетках маўчаць, як і іншыя звяры. Людзі — не. Заапарк — гэта месца дзе жывуць звяры, а не забаўляльны цэнтр, лічаць апаненты дырэктара. Ды і той гэта разумее, але па-іншаму

Мо і гэта «нябачная прычына» скаргаў — не ведаю. Ужо калі жывёлы — браты нашы меншыя, няўжо «старэйшыя» — людзі — не могуць зразумець адзін аднаго?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ВІСКІ БЕЗ АКЦЫЗАЎ

Каля 90 бутэлек, а гэта 61 літр шатландскага віскі без айчынных акцызных марак перавозіў пасажыр легкавушкі. Супрацоўнікі ДАІ а першай гадзіне ночы затрымалі ў Лёзне «Аўдзі-80» з гэтым грузам. Высветлілася, што вёз віскі 31-гадовы беспрацоўны. Складзены адміністрацыйны пратакол за парушэнне адпаведнага Дэкрэта Прэзідэнта.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**«24» ноября 2008 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит открытый аукцион по продаже здания, находящегося в собственности города Жодино и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания.**

**На аукционные торги выставляется:**

| Сведения о капитальном строении и его местонахождении | Продавец недвижимого имущества и арендодатель земельного участка | Основные характеристики капитальных строений | Общая площадь, кв. м | Площадь земельного участка, га | Срок аренды земельного участка, лет | Начальная цена продажи единого предмета аукциона (в т.ч. недвижимое имущество, право арены земельного участка), руб. | Сумма задатка единого предмета аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Здание специализированное для образования и воспитания (дошкольное учреждение № 3)** (инв. № 612/С-5631) и сарай расположены по адресу: Минская область, г. Жодино, ул. Куприянова, 7 «а» | Государственное учреждение «Жодинский территориальный центр социального обслуживания населения» Арендодатель земельного участка – Жодинский горисполком | Здание двухэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, полы дощатые, крыша шиферная. Имеются инженерные коммуникации. Год постройки – 1950. | 666,7 | 0,3458 земельный участок победитель использует для обслуживания здания | 25 | 143 071 557 (142 294 897 776 660) | 10 000 000 |

**Начальной ценой единого предмета аукциона** является сумма начальной цены продажи недвижимого имущества и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания.

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течении 10 рабочих дней со дня принятия Жодинским горисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2 заключаются договор купли-продажи недвижимого имущества и договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

***Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 21 ноября 2008 г. до 13.00.***

## Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка».* Якуб КОЛАС.

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* № 31 (281)

## Садовыя клопаты

● Вельмі важным мерапрыемствам у канцы кастрычніка — пачатку лістапада з'яўляецца ахова пладовых дрэў ад сонечных апёкаў і мышэй. Правядзіце абмазку ствалоў пладовых дрэў сумессю гліны з каравяком. Супраць сонечных апёкаў выкарыстоўваюць пабелку: 2,5 кг вапны і 0,5 кг меднага купарвасу на 10 л вады (у раствор можна дадаць 100 г сталярнага клею). Перад пабелкай здымаюць лоўчыя паясы, у дарослых дрэў ачышчаюць штамб і шкілетныя галінкі ад адмерлай кары, расцілаючы пад дрэвам плёнку ці мешкавіну. Работу праводзяць жалезным ці драўляным скрабком, драцяной шчоткай. Пасля апрацоўкі кара павінна быць гладкай на вобмацак.

● Каб лепш захаваць незімастойкія гатункі садовых дрэў, абгарніце ствалы лутрасілам ці мешкавінай, акучце іх зямлёй.

● Для лепшай зімоўкі каранёў суніц садовых насыпце ў радкі прэлай хвоі ці апалых лістоў (у крайнім выпадку торфу ці пілавіння).

● Унясіце вадкія ўгнаенні поўнага саставу пад культуры, якія кранаюцца ў рост ранняй вясной (парэчкі, маліна, агрэст). Угнаенні ўносьце не пад корань, а пырскайце па галінках.

● Дзе трэба, правядзіце вапнаванне глебы пад пладовымі дрэвамі (прыкладна 1 кг раскісляльніка на 3 квадратныя метры).

## Насенная бульба

**«Ці варта мыць насенную бульбу перад закладкай на захоўванне», — пытаецца Аліна Іосіфаўна са Смаргонскага раёна.**

Перад закладкай на захоўванне насеннай бульбы рэкамендуецца праводзіць так званае іх азеляненне на рассеяным сонечным святле на працягу некалькіх дзён (да з'яўлення добра прыкметнай зялёнай афарбоўкі клубня). Каб пазбегнуць сонечных апёкаў, нельга клубні пакідаць на інтэнсіўным сонечным асвятленні. Клубні, якія азеляняюцца, менш пашкоджваюцца хваробамі, лепш захоўваюцца. Мыць клубні перад закладкай на захоўванне не рэкамендуецца, так параілі вучоныя-бульбаводы. Захоўваць насенную бульбу варта ў такіх жа ўмовах, як і ўсю астатнюю, толькі, натуральна, у асобнай тары.

Акрамя таго, каб захаваць, напрыклад, бульбу ў зімовы перыяд, можна выкарыстаць некаторыя бактэрыцыдныя расліны, якія растуць у вашым агародзе. Можна змешваць клубні з зялёнымі лістамі рабіны (у суадносінах 5:1), з сухім горкім палыном, шалфеем, сніткай звычайнай (у такіх жа ці меншых суадносінах). Зімой, пры выяўленні ачагоў мокрых і сухіх гніляў, не варта перабіраць усю бульбу. Неабходна старанна выбраць хворыя клубні, а таксама тыя, што непасрэдна дакраналіся да іх здаровых клубні. Суцэльная пераборка будзе садзейнічаць толькі перазаражэнню бульбы і павялічыць колькасць хворых бульбін.



## КВАСІМ КАПУСТУ

Аб тым, што квашаная капуста карысная для здароўя, вядома даўно, яе ўжывалі ў ежу яшчэ старажытныя рымляне. Англійскі мараплавец Джэймс Кук лічыў адной з прычын удалай кругасветнай экспедыцыі пад яго кіраўніцтвам тое, што ён узяў з сабой на карабель 60 бочак квашанай капусты, таму яго спадарожнікі былі здаровыя і бадзёрыя. У квашанай капусце змяшчаецца вялікая колькасць вітаміну С, прычым захоўваецца ён на працягу 7 месяцаў, таму кіслая капуста лічыцца добрым проціцынговым сродкам.

Цяжка сказаць, калі славяне навучыліся квасіць капусту. Напрыклад, на Русі адным з першым упамінанняў аб гэтым прадукце сустракаецца ў царкоўным «Статуце» 1192 года. У спісе посных страў можна знайсці «капусту солону без масла».

Адрознівалі белую і шэрую квашаную капусту. Першую гатавалі з белакачаннай капусты па рэцэптах, якія захаваліся і амаль не змяніліся да нашых дзён. Белая салёная капуста была звычайным запасам як у багатых, так і ў бедных. Шэрую капусту атрымлівалі з той жа сыравіны, але слаі капусты перасыпалі разам з соллю жытнёвай мукой. У тым выпадку, калі соку пад гнётам было мала, у бочку для паляпшэння браджэння далівалі белы жытны квас. Магчыма таму гэты спосаб здаўна называецца «квашанне», а капусту «квашанай».

**КАПУСТА БЕЛАКАЧАННАЯ КВАШАНАЯ**

*Для засолкі бяруць буйныя качаны (пажадана позніх гатункаў), ачышчаюць ад зялёных і пашкоджаных лістоў, не мыюць. На 10 кг капусты — 150—250 г солі, 300 г морквы (можна больш), дадаюць лаўровы ліст, кроп, чорны горкі перац, насенне кмену, каляндры. Часам капусту квасяць з дабаўленнем яблыкаў (лепш за ўсё — гатунак Антонаўка, 800 г на 10 кг капусты), журавінаў ці брусніц (300 г на 10 кг капусты).*

На рад лістоў, пакладзеных на дно бочкі ці іншай тары, слаямі змяшчаюць нашаткаваную капусту, перамешаную з надзёртай на буйной тарцы морквай, перасыпаючы соллю і прыправамі. Капусту ўтрамбоўваюць для таго, каб выходзілі газы і яна пускала сок. Згодна з некаторымі рэцэптамі, нашаткаваную капусту раяць пераціраць з соллю на стале, аднак моцна мяць капусту нельга — яна атрымаецца нясмачнай.

Верхні слой закрываюць лістамі і на іх кладуць гнёт. Для гнёту можна выкарыстаць трохлітровы слоік з вадой ці вялікі камень. Пасуду, запоўненую капустай, паставіць у памяшканне пры тэмпературы 18—22 градусы. Пры гэтай тэмпературы пачынаецца працэс браджэння (ферментацыі), у выніку чаго ў капусце назапашваецца малочная кіслата, якая з'яўляецца кансервантам і перасцерагае прадукт ад псавання пры захоўванні.

У час браджэння на паверхні расолу з'яўляецца пена. Капусту 3-4 разы на дзень трэба пратыкаць да дна добра вымытай драўлянай палкай. Калі працэс браджэння заканчваецца, расол святлее, знікае пена, капуста асядае і набывае прыемны асвяжальны кіславата-салёны смак, хрумсціць на зубах.

Пасля заканчэння працэсу браджэння перанесці капусту ў халоднае месца. Калі ў вас няма склепа і вы засалілі невялікую колькасць капусты, перакладзіце яе ў шкляныя слоікі і пастаўце ў халадзільнік. Найлепшыя ўмовы для захоўвання квашанай капусты ствараюцца пры тэмпературы 0—2 градусы. Пры такой тэмпературы яна не робіцца празмерна кіслай. У час захоўвання трэба сачыць, каб капуста была ўвесь час пакрыта расолам і не з'яўлялася плесня.

**КАПУСТА БЕЛАКАЧАННАЯ, КВАШАНАЯ ПА-БЕЛАРУСКУ**

*10 кг капусты, 400—500 г морквы, 200—250 г солі, 30—50 г кмену. Гэты спосаб квашання капусты таксама старажытны і ўпершыню быў апісаны ў 1858 годзе.*

Узяць качаны сярэдняга памеру, зняць зялёныя лісты, нашаткаваць і старанна прамыць у вялікай колькасці халоднай вады. Калі вада сцячэ, шчыльна ўлажыць слаямі, перасыпаючы соллю і кменам. Кожны слой утрамбаваць, каб выпусціў сок, калі трэба, дадаць салёнай вады. Перакласці нашаткаванай морквай, дадаць журавіны, пакласці яблыкі. Калі пасуда будзе запоўнена поўнасцю, уставіць бярозавыя ці дубовыя палкі для выхаду брадзільных газаў з непрыемным пахам. Пратыкаць і вынімаць палкі трэба 2-3 разы на дзень. Пасуду трымаць у халодным месцы, у якім працэс браджэння доўжыцца 10—15 дзён. Калі ферментацыя закончыцца, накрыць чыстай сурвэткай, пакласці гнёт.

Некаторыя гаспадыні любяць квасіць капусту цэлымі качанамі. Цэльнакачанную капусту пры квашанні заліваюць 4-працэнтным расолам (40 г солі на 1 л вады). А яшчэ лепш дадаваць качаны ў нашаткаваную капусту, папярэдне крыжападобна надрэзаўшы іх або разрэзаўшы папалам і выразаўшы храпку.

Капуста, заквашаная на растучым месяцы ці ў поўню, будзе цвёрдай, хрумсткай. Аматары мяккай капусты квасілі яе ў апошнія фазы месяца.

## Запрашальнік

# Лёд колеру золата

24 кастрычніка на пляцоўцы сталічнага Палаца спорту будзе прадстаўлена танцавальна-музычнае шоу на лёдзе «Залаты лёд Страдывары». Што, здавалася б, агульнага паміж такімі рознымі паняццямі, як сучаснае фігурнае катанне і старадаўнія інструменты славутага скрыпічнага майстра? Адказ просты: сяброўства і супрацоўніцтва паміж алімпійскім чэмпіёнам Яўгенам Плюшчанкам і венгерскім скрыпачом Эдвінам Мартанам, які за перамогу ў прафесійным конкурсе атрымаў права 5 гадоў іграць на ўнікальнай скрыпцы Страдывары (а іх засталося ў свеце не больш як 10 інструментаў). Дарэчы, скрыпку, якая каштуе не менш за 2 мільёны долараў, будуць суправаджаць аж 4 ахоўнікі — гэта прапісана асобным пунктам у райдары артыстаў. Яшчэ два чалавекі пастаянна будуць суправаджаць саміх зорак.

Плюшчанка і Мартан праславіліся не толькі ў тандэме, але і ў складзе трыа — менавіта пры іх удзеле спявак Дзіма Білан нарэшце перамог на конкурсе «Еўрабачанне». Але да нас сябры прыедуць без Білана. Затое з відовішчнай праграмай, удзел у якой пад жывы гук скрыпкі бяруць знакамітыя фігурысты з розных краін свету: Сурыя Баналі, Наомі Ланг, Джэймсан Гратс, Пётр Чарнышоў ды многія іншыя спартсмены. У другім аддзяленні выступяць акрабаты і жанглёры, а таксама артыст арыгінальнага жанру Вадзім Савянкоў з лазерным шоу. А ў антракце 2,5-гадзіннага прадстаўлення Плюшчанка і Мартан абяцаюць раздаваць усім ахвотнікам аўтографы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**



# Ў гасцях ў казкі

### Здымаецца кіно

**На тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту пад Мінскам (блізу вёскі Строчыцы) з'явіўся новы экспанат. Больш чым незвычайны. Мяркуйце самі — гэта... хатка Бабы-Ягі. Дом не пустуе — Баба-Яга, вельмі падобная да Ліі Меджынаўны Ахеджакавай, там ва ўсю вядзе сваю гаспадарку. Каб разабрацца, што ж насамрэч адбываецца, мы адправіліся на месца падзей.**

**«Хацінка» аказалася вялікай. Агароджаная высачэзным плотам, над веснічкамі — каровін чэрап, побач з домам — курыныя ножкі, упрыгожаныя шыльдачкай «рамонт»... Зрэшты, ля веснічак жыццё віруе — людзі ў цёмнай вопратцы і масках на тварах, трымаючы коней пад цуглі, цягнуць двух маладых людзей — сялянскага хлапчука Івана ды баярскую дачку Клаву. Галоўны ў бандзе, чалавек са знешнасцю маладога, але папулярнага ўжо акцёра Артура Смальянінава, рашуча бухае кулаком у веснічкі. Адчыняе сама Баба-Яга з сімпатычным катом на руках. Акінуўшы гасцей непрыветным позіркам, старая цікавіцца:**

**— Зноў сваю зграю прыцягнуў? У нас ежы няма. Самі (сумны ківок на не менш сумнага ката) галадаем. Або (заўважыўшы палонных) гэта свежаніна? Тады занось у двор!**

**Дэлегацыя заходзіць унутр, і веснічкі з грукатам зачыняюцца. Здаецца, кагосьці зараз будуць есці...**

## Дысней пад Мінскам

Аказалася, у ціхае жыццё беларускага музея ўмяшаліся не хто-небудзь, а расійскае прадстаўніцтва кампаніі «Walt Disney», пры падтрымцы студыі «Тры Тэ» Мікіты Міхалкова. Упершыню легендарная казачная карпарацыя робіць казку ў Расіі і для Расіі; але для пачатку — у Беларусі, дзе праходзяць усе натурныя здымкі.

«Кніга Майстроў» — менавіта так называецца фільм, — безумоўна, казка. Прычым не заснаваная на якой-небудзь канкрэтнай гісторыі, гэта арыгінальны сцэнарый. Але сярод персанажаў другога плана хапае знаёмых з дзяцінства герояў — ужо ўзгаданая Баба-Яга, Кашчэй Бессмяротны (яго сыграе Гоша Куцэнка)...

Дзеянне адбываецца ў няпэўным месцы і часе — умоўна кажучы, гэткая Расія ўзору XVII—XIX стагоддзяў. У свеце мірна суіснуюць два розныя пласты жывых істот — звычайныя і казачныя. Сюжэт, як у любой чароўнай казцы, заснаваны на пошуку. Існуе дзіўная Кніга майстроў — калі прачытаць яе цалкам, атрымліваеш доступ да таямнічай сілы. Таму Кніга — жаданая здабыча для сілаў зла: Каменнай княжны (Ірына Апексімава) і яе воінаў. Але вось незадача — прачытаць кнігу можа толькі чалавек, дый тое не ўсякі, а толькі сапраўдны майстар сваёй справы. За ім і адпраўляе сваю армію на чале з галоўным Каменным воінам (Артур Смальянінаў), — выкрасці юнага каменярэза Івана (Максім Лакціёнаў).

Паралельна развіваецца нямала дадатковых ліній і, зразумела, не абыдзецца без добрай рамантыкі — Іван закахаецца ў дачку Каменнай княжны Кацю (Кацярына Андрэева), і... Словам, дабро пераможа.

Усе натурныя здымкі адбываліся ў Беларусі. Як расказаў менеджар па сувязях з грамадскасцю расійскага прадстаўніцтва «Walt Disney» Ігар Патапаў, здымачная група прыглядалася да некалькіх архітэктурных запаведнікаў. Насамрэч, не будаваць жа цалкам вёску. Калі высветлілася, што здымкі пачнуцца ў верасні-кастрычніку, спыніліся на Беларускім музеі архітэктуры і побыту. Па-першае, кажуць, залатая восень у нас трымаецца крыху даўжэй. Па-другое, у музеі прадстаўлена нямала ўзораў драўлянага народнага дойлідства: хаты, свіраны, млыны, карчма, цэрквы — усё сапраўднае — былі перавезены з розных куткоў краіны. І разам з тым, што немалаважна, музей месціцца зусім блізка да вялікага горада.

Інтэр'еры будуць здымацца ўжо ў Расіі, у павільёнах «Масфільма». У сапраўднасці атрымліваецца так: дзверы дома звонку знаходзяцца пад Мінскам, а тыя ж дзверы знутры — ужо ў Маскве. «Зробіце крок, апынецеся на «Масфільме», — жартавалі з аўтара гэтых радкоў апепаратары, калі я, знайшоўшы момант, спрабавала падгледзець, што ж там унутры хацінкі. За парогам — практычна нічога няма...

Дарэчы, хацінка Бабы-Ягі па сюжэце знаходзіцца ў лясным гушчары, таму яго будуць пазней дамалёўваць на камп'ютары. Будуць у фільме і анімаваныя персанажы — напрыклад, чароўны клубок, што пакажа галоўнаму герою дарогу. Працуе ён на манер аўтанавігатара: не каціцца моўчкі, куды трэба, а папярэджвае героя загадзя: «праз 500 метраў звярнуць налева». Вядома, што мультыплікацыйных персанажаў таксама будуць агучваць зоркі расійскага кінематографа — напрыклад, Валянцін Гафт.



Фота Віктара ЗАЙКОЎСКАГА.

## Коні расійскія, кот — беларускі

Нягледзячы на тое, што вялікая частка здымак праходзіць на беларускіх землях, акцёры нашы ў праекце не задзейнічаны — хіба толькі ў якасці масоўкі ў некалькіх сцэнах у вёсцы. Нават коні прыбылі з Масквы. Зрэшты, гэта разумна — Смальянінаву даводзіцца нямала скакаць верхам, таму жывёлам трэба было прайсці неабходную падрыхтоўку. А вось кот у Бабы-Ягі мясцовы, чорна-белы, з плямкай на носе, завуць Цішка. Кажуць, яму таксама давялося праходзіць кастынг у рэжысёра Вадзіма Сакалоўскага. На здымках Цішка паводзіў сябе стрымана, а вось у паўзах паміж сцэнамі спрабаваў забіцца ў кут і жаласліва мяўкаў — напэўна, не мог апрытомнець ад шчаслівай магчымасці сядзець увесь дзень на руках у самой Ахеджакавай. Не кожнаму выпадае такі дэбют у кіно!



Самі ж артысты пры кожнай паўзе хуталіся ў коўдры — сёлета восень у нас хоць і залатая, але з халодным ветрам, а хацінка стаіць практычна ў чыстым полі, і прадзімаецца, на жаль, вельмі добра.

— Самае складанае ў гэтых здымках — надвор'е, — дзеліцца Максім Лакціёнаў, выканаўца галоўнай ролі каменярэза Івана. — Холад пастаянны, ды яшчэ дажджы час ад часу набягаюць. Але працаваць з такімі акцёрамі — гэта непаўторнае адчуванне, я раней бачыў іх у тэлевізары, чытаў у газетах, а тут хоп! — і мы ў адным праекце. Натуральна, прысутнічае і мандраж, тым больш, гэта дэбютная роля, але ў любым выпадку, лічу, мне вельмі пашанцавала! Стараюся ўсё прыкмячаць і ўспрымаць, што робяць акцёры і як.

У адной са сцэн, да прыкладу, Максіму трэба было сказаць Ахеджакавай: «Дурная ты старая баба».

— Вядома ж, страшна было, — прызнаецца хлопец, — але ж гэта я не Ахеджакавай, а самой Бабе-Язе, гэта проста роля... А яшчэ я ўпершыню сядзеў на кані! Нічога лепшага дагэтуль у жыцці не было. І нават па камянях дзяўбаць спадабалася — мне далі малаток і сказалі: «Дзяўбі, як хочаш»... Але ўсяго я вам не раскажу, што атрымалася, самі пабачыце!

Дарэчы, для ролі сялянскага хлопца Івана акцёру давялося крыху змяніць знешнасць — адрасціць валасы і асвятліць іх.

А Вользе Ергінай (баярская дачка Клава, якую разам з Іванам скралі каменныя воіны), якая таксама дэбютуе ў вялікай ролі, — эпізадычныя ў актрысы ўжо былі, — спатрэбілася толькі пафарбаваць валасы ў ярка-рыжы колер.

— А вяснушкі ў мяне свае такія, — смяецца дзяўчына, — таму іх з нуля не малююць, толькі робяць трохі ярчэйшымі. Увогуле я з дзяцінства марыла зняцца ў казцы! Па ролі я баярская дачка — капрызнае дзіця, якое хоча атрымаць адразу ўсё. Клава марыць удала выйсці замуж — усё адно за каго. Але яна не адмоўная гераіня, хутчэй, камічная. Правобраз яе — напэўна, усё ж Марфушачка-душачка з фільма-казкі «Марозка». Я сама вельмі люблю гэту казку, і Марфуша ў маёй ролі, безумоўна, прысутнічае.

Самым складаным для Вольгі, як ні дзіўна, стаў не пранізлівы холад, а сцэна з яе выкраданнем: «Я дагары нагамі вісела на кані! Вось гэта было самае цяжкае!».

У Артура Смальянінава на пляцоўцы няма ніводнай вольнай хвіліны. Правадыр каменных воінаў (дарэчы, адзіны з іх без маскі — відаць, гэта ў сілаў зла асаблівы знак адметнасці) заняты пастаянна. Але высветліць, як Артур адчувае сябе ўнутры казкі, усё ж удалося.

— Мне вельмі падабаецца здымацца ў казках, — ззяе галівудскай усмешкай акцёр. — Гэта ж хуліганіць можна! Мой персанаж адмоўны, яму нікога не шкада і шкада быць не можа, бо ён каменны, і сэрца ў яго каменнае, ён не адчувае нічога. Вось прывезлі да Бабы-Ягі сёння свежаніны, яна нас за гэта будзе лячыць... А палоннікаў няма чаго шкадаваць... Так што, калі маім персанажам будуць палохаць дзяцей, я не пакрыўджуся. Галоўнае, каб мной не палохалі!

...Толькі Лія Ахеджакава настолькі ўвайшла ў ролю, што журналістаў катэгарычна не заўважала — лічыла, што пабочныя людзі на здымачнай пляцоўцы «разбураюць патрэбную атмасферу». Таму народную артыстку Расіі ніхто ад працы не адцягваў — а раптам, калі і не з'есць, то зачаруе?

У пракат фільм плануецца выпусціць восенню наступнага года.

**Кацярына ЧАСТНОВА.**

## Гандляваў мясам дзічыны...

І пра гэта стала вядома работнікам Кармянскай міжрайінспекцыі. Яны і ўстанавілі факт незаконнай здабычы лася ў паляўнічых угоддзях Кармянскага раёна. А калі сумесна з міліцыянерамі правялі агляд домаўладання непрацуючага з вёскі Сямёнаўка, знайшлі ў халадзільніку 10 кілаграмаў мяса дзічыны. Падчас следча-аператыўных мерапрыемстваў былі ўстаноўлены яшчэ дзве асобы, што мелі дачыненне да незаконнага палявання. Яны аказаліся жывёлаводамі СВК «Нова-Зянькоўскі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.53 | 17.54 | 10.01 |
| Віцебск — | 7.46 | 17.41 | 9.55 |
| Магілёў — | 7.43 | 17.44 | 10.01 |
| Гомель — | 7.36 | 17.44 | 10.08 |
| Гродна — | 8.07 | 18.09 | 10.02 |
| Брэст — | 8.05 | 18.13 | 10.08 |

**Месяц**

*Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**

**Пр.** *Андрэя, Інакенція.*
**К.** *Іветы, Марлены, Тэклі, Ігната, Севярына, Тодара, Яна.*




## Дзве даты

## 23 кастрычніка

**1823 год** — у вёсцы Замосце на Случчыне нарадзіўся Адам Плуг (Антоній Антонавіч Пяткевіч), беларускі пісьменнік і публіцыст. Пасля заканчэння Кіеўскага ўніверсітэта жыў на Стаўбцоўшчыне, затым у Мінску, сябраваў з У. Сыракомлем, В. Дуніным-Марцінкевічам, С. Манюшкам. За садзейнічанне паўстанню 1863—64 гадоў быў зняволены. Пасля вызвалення жыў у Варшаве, дзе арганізаваў беларускі культурна-асветніцкі гурток. Аўтар аповесцяў «Споведзь», «Нянька», «Афіцыяліст», зборніка «Калоссі з роднай нівы». Пісаў артыкулы і нарысы аб культурным жыцці Беларусі. Першым перавёў на польскую мову творы Дуніна-Марцінкевіча, перакладаў таксама Гейнэ, Пушкіна, Гюго, Шэкспіра. Памёр у 1903 годзе.



**1917 год** — Ленін, які нечакана з'явіўся на пасяджэнні ЦК РСДРП (б), пераламаў ход галасавання і настаяў на прыняцці рэзалюцыі аб узброеным паўстанні.

## Цытата дня:

***«Прымаць парады ворагаў — памылка, але выслухоўваць іх трэба, каб паступіць наадварот. Гэта і будуць сапраўды правільныя дзеянні».***

**Саадзі (1209—1292), персідскі пісьменнік.**

## Паритетбанк

*ОАО «Паритетбанк» г. Минск, ул. Гамарника, 9/4*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2008 г.

***(в миллионах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2008 | 01.10.2007 |
|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 6 104,9 | 2 742,4 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 33 867,3 | 2 650,9 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 36 735,5 | 65 760,2 |
| | для торговли | 11031 | — | — |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | — | — |
| | в наличии для продажи | 11033 | 36 735,5 | 65 760,2 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 20 898,3 | 1 485,0 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 179 287,4 | 118 922,1 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | — | — |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 14 870,5 | 12 583,3 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 6 277,7 | 3 000,9 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 298 041,6 | 207 144,8 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 55 000,0 | 55 000,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 55 830,4 | 15 054,4 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 66 535,5 | 32 173,1 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 10 320,6 | 58,4 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 3 443,9 | 1 436,2 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 191 130,4 | 103 722,1 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 93 368,4 | 93 368,4 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | — | — |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 964,3 | 267,3 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 8 402,7 | 7 039,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 4 175,8 | 2 747,3 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 106 911,2 | 103 422,7 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 298 041,6 | 207 144,8 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 175 087,9 | 67 518,0 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 74 221,9 | 4 172,9 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2008 года

***(в миллионах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2008 | 01.10.2007 |
|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 20 800,0 | 15 298,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 7 676,2 | 2 338,6 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 13 123,8 | 12 959,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 3 273,7 | 2 031,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 162,4 | 92,1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 111,3 | 1 938,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 1 279,4 | 625,9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (-86,3) | 58,5 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | — | — |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 867,5 | 1 890,0 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 1 150,5 | 266,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 12 061,1 | 7 467,2 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 929,5 | 354,3 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 719,5 | 711,8 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 4 001,1 | 5 426,2 |

**И.о.Председателя Правления** **В.И. Коршун**

**Главный бухгалтер** **М.М. Абраменко**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.*

## СОСТОЯЛСЯ ВТОРОЙ РОЗЫГРЫШ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

SMOK TRAVEL www.smoktravel.com

## «У СМОК ТРАВЭЛ ЮБИЛЕЙ — ГОД ПОДАРКОВ ДЛЯ ДРУЗЕЙ!»

9 октября 2008 г. состоялся второй промежуточный розыгрыш рекламной игры «У СМОК ТРАВЭЛ юбилей – год подарков для друзей!» (свидетельство о государственной регистрации № 1003 от 07.04.09).

По вопросам получения приза участники рекламной игры могут обращаться по тел. (017) 284 58 95 с 9.00 до 18.00 с понедельника по пятницу.

Призы выдаются по предъявлению Купона участника рекламной игры (с присвоенным клиенту идентификационным номером) и паспорта в течение 60 дней с момента проведения розыгрышей в офисе ИП «СМОК ТРАВЭЛ лтд» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 40.

*Поздравляем победителей!!!*

| ФИО победителя | Приз | Номер купона |
|---|---|---|
| Смирнова Н. | Телевизионный приемник Prestigio P7220HDD-D 22 TFT | 1220 |
| Залужная Е. | Мобильный телефон Nokia 5140i | 2597 |
| Кабяк И. | Уик-енд на двоих в Вильнюсе (проживание в отеле Mabre Residence 3дня/2 ночи) | 1964 |
| Жильчик Г. | Сертификат на трехмесячный абонемент в велнесс центре «Forest Hall» (групповые занятия + бассейн, 24 посещения) | 3474 |
| Талайко Н. | Сертификат на ужин на 2-х человек в ресторации «Семь комнат» на 200 000 белорусских рублей | 15100 |
| Сахарук Б. | Сертификат на ужин на 2-х человек в ресторации «Семь комнат» на 200 000 белорусских рублей | 526 |
| Хатько А. | Сертификат на ужин на 2-х человек в ресторации «Семь комнат» на 200 000 белорусских рублей | 1443 |
| Журавлев П. | Сертификат на обслуживание в салоне красоты «Прикосновение» на 200 000 белорусских рублей | 3440 |
| Сапогов И. | Сертификат на обслуживание в салоне красоты «Прикосновение» на 200 000 белорусских рублей | 774 |
| Колос Е. | Сертификат на обслуживание в салоне красоты «Прикосновение» на 200 000 белорусских рублей | 2625 |
| Михейкина Л. | Сертификат на обслуживание в салоне красоты «Прикосновение» на 200 000 белорусских рублей | 2002 |
| Василевич Н. | Сертификат на получение клубной карты на годовое членство в Общественной организации «Белорусский клуб автомототуризма». Пакет «Эконом» | 2633 |
| Кухарчик Н. | Сертификат на получение клубной карты на годовое членство в Общественной организвции «Белорусский клуб автомототуризма». Пакет «Эконом» | 3338 |
| Акулич В. | Сертификат на получение клубной карты на годовое членство в Общественной организвции «Белорусский клуб автомототуризма». Пакет «Эконом» | 33 |

УНН 190592930

# УДАЎСТВО

### Свет і сусвет чалавека

**Удаўства — сацыяльны стан чалавека адносна шлюбу: удовамі і ўдаўцамі звалі тых, у каго памерлі муж ці жонка.**

- У народнай традыцыі ўдаўства ўспрымаецца як негатыўны, непаўнацэнны стан, які забараняе ўдзельнічаць у сямейна-родавых святах, вясельных абрадах, быць хроснымі бацькамі, быць павітухай, прысутнічаць на ўлазінах і г.д.
- Маці ці бацька, якія аўдавелі, не маглі весці пад вянец і сустракаць пасля вянца сваіх дзяцей, каб не перадаць ім свой лёс. На іх месца абіралі пасаджоных бацькоў.
- У той жа час жанчына-ўдава, якая не брала другі шлюб пасля смерці мужа, надзялялася ў грамадстве статусам нявіннасці або рытуальнай «чысціні». Часцей за ўсё яна станавілася знахаркай і магла лячыць, адводзіць эпідэміі, градавыя хмары, мор жывёлы і г.д.
- Каб не аўдавець забаранялася за ежай мяняць месца, хадзіць па хаце ў адной шкарпэтцы, адным боце.
- Па той жа прычыне не гулялі вяселлі па панядзелках і ў вісакосны год.
- Сярод славян існавала павер'е, што дзяўчына з «цяжкай» хадой стане ўдавой.
- Прадказаннем удаўства былі некаторыя прыкметы ў час вянчання: калі падаў вянок ці кветка з вянка нявесты; калі падала хустка нявесты.
- Асобнае месца ў прадказаннях удаўства адводзілася пярсцёнку: калі ён падаў у час вянчання; калі ён губляўся.
- Калі з пярсцёнка выпадаў каменьчык, гэта прадказвала смерць аднаго з пары. Такі пярсцёнак насіць катэгарычна забаранялася.
- Пасля смерці аднаго з супругаў існаваў цэлы шэраг рытуальных дзеянняў, якія маглі паспрыяць новаму шлюбу. Так, у час пахавання памерламу мужчыне расшпільвалі гузікі на кашулі, жанчыне развязвалі ўсе вузлы на вопратцы. У той жа час, калі свякроўка не жадала, каб нявестка выйшла замуж яшчэ, яна спецыяльна завязвала на целе памерлага сына нітку, пояс ці гальштук.
- Новы шлюб удавы пасля смерці мужа асуджаўся аднавяскоўцамі. Казалі: *«Той не ведаў бяды, хто не сватаўся да маладой удавы»*. Удаўца, які застаўся з дзецьмі, таксама не лічылі «зайздросным» жаніхом, пра яго казалі: *«Удавец, што разбіты гаршчок»*.
- Звычайна, новае вяселле можна было гуляць пасля заканчэння памінальнага года. У некаторых рэгіёнах жанчынам забаранялася выходзіць замуж на працягу трох гадоў пасля смерці мужа. Для мужчыны гэты тэрмін быў скарочаны: пасля 40 дзён, асабліва, калі ў яго на ўтрыманні было некалькі дзяцей і вялікая гаспадарка.
- У выпадку другога шлюбу пасля страты першага супруга вясельны рытуал не адмянялі ўвогуле, але скарачалі да мінімуму: не наладжвалі дзявочыя вячоркі, нявесце не апраналі вясельны вянок, вэлюм, вясельны строй белага колеру (яна вянчалася як «нячэсная» дзяўчына), не патрабавалі пасагу, не запальвалі свечы ў час вянчання, не пяклі вясельны каравай.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Пытальнік

# Пасылка з-за мяжы ад сябра абкладаецца падаткам

**— З верасня мінулага года па май гэтага атрымаў пяць пасылак ад сябра з Украіны. Ён прысылаў мне ў падарунак былыя ў карыстанні радыёдэталі. На кожнай пасылцы была ўказана сума кошту (для страхавання) у межах 20—40 тысяч рублёў. Ці падлягаюць падаткаабкладанню такія пасылкі?**

**Ігар КІЕНЯ,** *г. Баранавічы.*

— Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў», аб'ектам падаткаабкладання з'яўляюцца даходы, атрыманыя ад крыніц за межамі нашай краіны. Даходы ў выглядзе таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў, атрыманыя пры дапамозе паштовых аддзяленняў сувязі, для мэтаў падаткаабкладання адносяцца да даходаў, атрыманых у натуральнай форме.

Памер абкладаемага падаткам даходу, атрыманага грамадзянінам з-за мяжы ў натуральнай форме праз аддзяленне сувязі, вызначаецца згодна з коштам на дакументах, якія пацвярджаюць атрыманне паштовай пасылкі. Калі кошт пасылкі не ўказаны, тады фізічная асоба самастойна заяўляе аб памеры атрыманага даходу, згодна з якім падатковыя органы налічваюць для выплаты падатковы падатак. Пры гэтым адначасова з дэкларацыяй кліент павінен прадставіць тлумачэнні адносна змесціва пасылкі.

Падатковая дэкларацыя аб атрыманым на працягу падатковага перыяду сукупным гадавым даходзе падаецца ў падатковы орган не пазней за 1 сакавіка. Разлік падатку ажыццяўляецца падатковым інспектарам на працягу 15 дзён з дня падачы падатковай дэкларацыі. Падатак трэба выплаціць не пазней чым праз 15 дзён з дня атрымання адпаведнай паперы падатковага органа.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

## У РАБОЧЫХ КАНФІСКАВАЛІ БРАГУ

Супрацоўнікі Расонскага РАУС у доме 44-гадовай рабочай знайшлі і канфіскавалі 110 літраў самагоннай брагі. У той жа дзень літаральна праз 20 хвілін у Шаркоўшчынскім раёне аналагічную прадукцыю — 150 літраў — канфіскавалі ў 38-гадовага рабочага. Вядзецца праверка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Усміхнёмся!

**Бабуля пытаецца ў маленькага ўнука:**
**— Хто разбіў акно?**
**— Мама. Але вінаваты тата. Ён прысеў, калі талерка ляцела ў яго галаву.**

☺

Двое мужыкоў апынуліся на незаселеным востраве. Зусім здзічэлі. Неяк глядзяць — плыве па моры карабель. Адзін крычыць:

— Ура! Цяпер ён падплыве да берага і з яго сыдуць людзі!

Другі змрочна басуе:

— Так. Мяса на ўсю зіму нарыхтуем...

☺

**— Мае сябры вырашылі са мной згуляць у падкіднога дурня.**
**— Гэта як?**
**— Ды напаілі і падкінулі мяне ўласнай жонцы...**




☺

У Чалябінску зарплату рабочым сталі закапваць на глыбіню ў 40 метраў. Тэмпы будаўніцтва метро выраслі ў некалькі разоў.

## Пераможцам конкурсу «Лепшы вясковы падворак» стала сям'я Перамотавых з Віцебскай вобласці

**Пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Лепшы вясковы падворак» стала сям'я Аляксея і Наталлі Перамотавых з Віцебскай вобласці. Такое спаборніцтва правёў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.**

Сям'я Перамотавых жыве ва ўласным доме толькі тры гады. Але любоў гаспадароў да сваёй зямлі, свайго дома відавочная — і сам дом, і прысядзібная гаспадарка ўтрымліваюцца ў ідэальным парадку, у садзе шмат сліў, яблынь і груш, тэрыторыя прыгожа афармлена. Сям'я Перамотавых выхоўвае чацвярых дзяцей. Яны дапамагаюць бацькам па гаспадарцы, разам даглядаюць сад і агарод.

Пры падвядзенні вынікаў конкурсу звярталася ўвага не толькі на арыгінальнасць афармлення дваровай тэрыторыі, але і санітарна-гігіенічнага стану падворкаў, выкарыстанне нацыянальных традыцый у афармленні падворка, жылога дома, а таксама стварэнне ўмоў для паўнацэннага развіцця дзяцей у сям'і (спартыўныя пляцоўкі, дзіцячыя пакоі).

Другое месца ў спаборніцтве занялі Віталь і Аксана Агароднікі з Мінскай вобласці, трэцяе — Мікалай і Таццяна Піпер з Брэсцкай вобласці. Усяго на ўдзел у конкурсе былі пададзены заяўкі ад 850 сем'яў. Іх колькасць у параўнанні з мінулым годам павялічылася ўдвая. На сустрэчы з пераможцамі першы сакратар ЦК БРСМ Юрый Крывадубскі адзначыў, што за два гады конкурс стаў вельмі папулярным сярод моладзі. Ён выказаў надзею, што налета ў мерапрыемстве возьмуць удзел яшчэ больш маладых сем'яў, асабліва з ліку членаў маладзёжнай арганізацыі.

**Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.**

